Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ПК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СНЕЖАНЬ 19 1933 г. АЎТОРАК № 279 (4823) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЮБІЛЕЙНЫ ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ

Таварышу СТАЛІНУ

ЦК ВКП(б) і табе, дарагому настаўніку, нескаўнаму сталёваму большэвіку, руліваму краіны Совецтаў IX пленум ЦК ЛКСМБ шле сваё бадзёрае гарачае прывітанне.

Ленінскі комсомол Беларусі сёння адзначае знаменальную дату свайго гарачнага 15-гадовага існавання.

ЛКСМБ і ўся БССР за 15 год свайго існавання, пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і брацкай дапамогай з боку саюзных рэспублік дабіліся агромадзейшых поспехаў у справе гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Толькі дзякуючы твайму мудраму кіраўніцтву, дарагі настаўнік і правадыр сусветнага пролетарыята — тав. Сталін, ленінская нацыянальная палітыка атрымала трыумф і перамогу ў СССР. БССР з каланіяльнай краіны ператварылася ў індустрыяльна-аграрную. Развіваецца нацыянальная культура па форме і сацыялістычная па зместу. БССР падняслася на небывалую вышыню, ператвараючыся ва ўзорную сацыялістычную рэспубліку.

Ленінскі комсомол пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі правёў вялікую барацьбу са ўсякімі адхіленнямі ад генеральнай лініі партыі.

ЛКСМБ у далейшым будзе нястомна мацаваць гаспадарча-палітычную і абаронную магутнасць Беларускай рэспублікі, біцца за паўхільнае правядзенне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Запэўняем ЦК ВКП(б) і цябе, дарагі тав. Сталін, што к XVII з'езду партыі комсомол Беларусі прыдзе з новымі дасягненнямі. Мы абяцаем дабіцца новых перамог, яшчэ шчыльней згуртаваць свае рады вакол нашай партыі і яе правадыра тав. **Сталіна.**

Няхай жыве наша большэвіцкая партыя і яе Ленінскі ЦК!

Няхай жыве наш любімейшы, не пахісны правадыр сталёвы тав. Сталін!

Няхай жыве комсомольскае племя!

Прывітанне пленума ЦК КП(б)Б—т. ГІКАЛО

Дарагі Мікалай Фёдаравіч!

У дзень спаўнага юбілея ленінскага комсомола Беларусі ўрачысты пленум ЦК ЛКСМБ шле табе, выпрабаванаму большэвіку, прыяцелю і кіраўніку ЛКСМБ гарачае комсомольскае прывітанне.

Мікалай Фёдаравіч, мы хочам табе шчыра сказаць, што поспехі, дасягнутыя комсамолам Беларусі, ёсць результат неаслабнага, штодзённага большэвіцкага кіраўніцтва ЦК КП(б)Б, які ты ўзначальваеш.

Нашы поспехі ёсць рэзультат перамогі генеральнай лініі партыі, рэзультат генеральнейшага кіраўніцтва ЦК ВКП(б) і тав. СТАЛІНА.

Твае асабістыя ўказанні, твая пера дача нам, маладому пакаленню большэвікоў, вопыта барацьбы і традыцый КП(б)Б, за генеральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку акружаюць спуклыі і спуск баявой праграмай нашай работы.

У дзень нашага юбілея мы ў тваёй асобе даём клятву Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б і надалей яшчэ больш, яшчэ мацней падняць сваю рэвалюцыйную пільнасць, мацаваць класавую свядомасць, загартоўваецца ў духу пролетарскага інтэрнацыяналізма, цэментаваць свае рады ў змаганні з класавым ворагам і яго агентурай унутры партыі і комсомола.

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ высока несці сцяг Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, пільна берагчы яго чыстату.

МЫ ДАЕМ КЛЯТВУ НАШАЙ ПАРТЫІ, што, не шкадуючы сіл, крыві, а калі трэба будзе і жыцця, аддамо за справу Леніна, Сталіна, за справу сусветнай пролетарскай рэвалюцыі.

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ мацаваць абароназдольнасць нашай краіны, умацоўваць магутнасць нашай непераможнай Чырвонай арміі, авалодваць ваеннай тэхнікай і, калі патрэбна будзе, па прызыву нашай партыі стаць жалезнымі батальёнамі, аўладаўшымі ваенным майстэрствам сучаснага бою на абарону завяванняў Окцябра.

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ падрыхтаваць кадры класава-вытрыманых, большэвіцка-праверанных, стойкіх непахісных ленінцаў для ўсіх франтоў вялікай сацыялістычнай будоўлі.

МЫ КЛЯНЕМСЯ НАШАЙ ПАРТЫІ І ЯЕ ЦК, што будзем мацаваць фарпост Совецкага Саюза — БССР, будзем павышаць наш узровень у барацьбе за аўладанне тэхнікай, за асваенне новых прадпрыемстваў, за большэвіцкія калгасы, за заможнае калгаснае жыццё.

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ напружыць усе сілы для далейшага ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі, напружыць сілы на барацьбу з контр-рэвалюцыйнымі буржуазнымі нацыяналістамі ўсіх мастей і адценняў, напружыць сілы на заваяванне далейшых перамог у будаўніцтве нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу культуры. Мы будзем напружваць усе сілы, волю энергію, каб выхаваць з сябе стойкіх інтэрнацыяналістаў большэвікоў, годных насіць высокае імя правадыра і настаўніка — Владзіміра Ільіча Леніна.

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ ва ўсёй сваёй рабоце ўжываць ленінскі стыль г. зн. злучаць рускі рэвалюцыйны размах з амерыканскай дзелавітасцю. Гэтага мы дасягнем толькі штодзённа, штогадзінна авалодваючы вышынямі марксізма-ленінізма, злучаючы рэвалюцыйную тэорыю з рэвалюцыйнай практыкай.

МЫ АБЯЦАЕМ з гонарам апраўдаць ганаровую назву дамок і сыноў нашай вялікай ленінскай партыі.

У дзень нашага юбілея клянемся Цэнтральнаму Камітэту і надалей яшчэ больш, яшчэ энергічней біцца за ленінскую лінію нашай партыі, за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадства.

Няхай жыве наша спаўная большэвіцкая партыя — арганізатар і правадыр комсомола!

Няхай жыве лепшы з лепшых ленінцаў — правадыр партыі і сусветнага пролетарыята — тав. СТАЛІН!

Няхай жыве КП(б)Б і яе ЦК на чале з стойкім большэвіком-ленінцам, прыяцелем і кіраўніком ленінскага комсомола Беларусі — тав. ГІКАЛО!

ЖАДАЮ ЯШЧЭ БОЛЬШЫХ ПЕРАМОГ

Обкам ленінскі комсомол Беларусі адзначае радасную і яркую гадавіну—15-годдзе свайго існавання.

У гэту слаўную гадавіну комсомолу Беларусі шлю сваё палкае прывітанне.

За пройдзеныя 15 год на ўсіх участках барацьбы—у грамадзянскай вайне, у барацьбе супроць акупантаў, на фронце сацыялістычнага будаўніцтва—комсомол Беларусі з гонарам апраўдаў сваю назву вернага памочніка партыі. Комсомол ставала выхавала і загартавала наша комуністычная партыя пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна, і гэта забяспечыла нашы комсомольскія перамогі.

Ваша галаўная падваліць вынікі ўзнаўленняму адрэзку пройдзенага шляху, агромадным результатам завершаных спраў. Але многа яшчэ задач стаіць перад вамі, многа яшчэ трэба зрабіць упоравае для паскарэння справы перамогі комунізма. Для гэтага патрэбна, каб кожны комсомолец, кожная комсамолка, маладзі рабочы і калгаснік авалодвалі вышынямі тэхнікі, зелаці сваю справу, сталі больш культурнымі, дысцыплінаванымі і арганізаванымі.

Хачу асобна спыніцца на вашых задачах у сувязі з чысткай партыі. Комсомол павінен дапамагчы партыі правільна скарыстаць новую хвалю палітычнай і вытворчай актыўнасці працоўнай моладзі, актыў вёскі, выклікаўшай чысткай партыі.

Неабходна, каб вынікі чысткі партыі паслужылі комсомолу для яшчэ большага ўзмацнення выхаваўчай работы і таварыцкай вучобы, бо сёла кожнага комсомольца павінна заключацца ў ідэйнай яго ўзброенасці, ясным разуменні пастаўленых перад ім партыяй задач, уменні энергічна і настойліва змагацца за генеральную лінію партыі. Неабходна ўларта працаваць над сабой, над аўладаннем тэорыі Маркса-Леніна-Сталіна. Трэба выхоўваць кожнага комсомольца, усю моладзь у інтэрнацыянальным духу вучыцца на гісторыі нашай партыі, на прыкладах жыцця і барацьбы Леніна і Сталіна.

Жадаю комсомолу Беларусі яшчэ больш, небывалых, новых (перамог ва ўсёй рабоце пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і любімага правадыра міжнароднага пролетарыята тав. Сталіна.

САХАРАВА.

Палітаддзелы БССР у барацьбе за большэвіцкія калгасы

Палітаддзелы МТС і саўгасаў, стваёныя па ініцыятыве правадыра нашай партыі і сусветнага пролетарыята тав. СТАЛІНА за параўнаўча кароткі адрэзак часу сталі важнейшымі вагарамі партыі ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў.

Першыя кроі работы палітаддзелаў показалі калгасным масам, што на вёску прышлі новыя людзі — большэвікі-арганізатары, уваходзячыя ва ўсе дэталі калгаснага жыцця і вытворчасці.

Палітаддзелы, пачаўшы свае работу непасрэдна першай большэвіцкай вясны 2-й пяцігодкі адразу-ж узяліся за ачышчэнне МТС і калгасаў ад кулацкіх контр-рэвалюцыйных і нацдэмаўскіх элементаў, якія ціхай сапай вялі сваю падрыўную работу ў калгасах.

Значальны ўдар, нанесены палітаддзелямі кулацтву і контрэвалюцыйнаму нацыянал-дэмакратызму, дарэшты пераможны вынік весняной сяўбы і далейшых сельскагаспадарчых работ.

Палітаддзелы згуртавалі вакол сябе масы чесных калгаснікаў, якія ў барацьбе з кулацтвам дказалі сваю адданасць калгаснаму ладу, узялі ярацэ калгасных мас супроць расцярушальнікаў грамадскай упасенасці і дробнабуржуазнай распушчанасці, узялі новую хвалю працоўнага энтузіязма і актыўнасці ў калгасах.

Дзякуючы дапамозе палітаддзелаў выкананне плана збожжагастаўкі ў гэтым годзе прайшло ніякімарэльна лепш чым за ўсе мінулыя гады. У пераважнай большасці калгасаў БССР дасягнута больш высокая ўраджайнасць, працадзень стаў на мно вышэй чым летась. Зроблен рашучы крок на шляху да перагаварэнню ўсіх калгасаў у большэвіцкія, а ўсіх калгаснікаў у заможных.

«Палітаддзелы МТС, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК працавалі не пазнна. У палітаддзелаў ужо боць не былы вопыт работы, але не трэба за ўзяць таго, чаму вучыў ЛЕНІН, вучыў і вучыць тав. СТАЛІН — НЕ ЗАЗНАВАЦЦА, НЕ ДАПУСКАЦЬ НІЯКАГА ГАЛАВАКРУЖЭННЯ АД ПОСПЕХАЎ. Будзем памятаць, што ў перадзе стаіць яшчэ больш адказныя і складныя задачы».

Гэтыя словы тав. КРЫНІЦКАГА на нарадзе начальнікаў палітаддзелаў МТС ЦЧВ у поўнай меры адносяцца і да палітаддзелаў БССР.

Адставанне БССР у апрацоўцы і здачы ільнапрадукцыі ў параўнанні з усімі іншымі абласцямі Совецкага Саюза паказвае, што не гэтым важнейшым участку дапушчан яўны саманёк, калгасныя масы яшчэ не мабілізаваны для сакрушальнага разгрома кулацкага сабатажа ільназагатовак.

Падрыхтоўка да вясны разгортваецца таксама недазваляюча. Той факт, што БССР, якая даўно закончыла выкананне збожжа- і бульбагастаўак, зараз недапушчальна запазлае сеяцку насенных і страхавых фондаў, сведчыць, што рад роённых партыйных і совецкіх арганізацый недаацэньваюць рашаючага значэння своечасовай сеяцкі добраякаснага насення для барацьбы за больш высокі ўраджай будучага года.

Палітаддзелы ў гэтым годзе дабіліся безумоўных поспехаў у справе арганізацыі работы трактарнага парку. Але дрэнная арганізацыя рамонта мінулага года і зусім нездавальняючая падрыхтоўка трактарыстаў не далі магчымасці скарыстаць поўнасцю ўсю магутнасць нашага трактарнага парка.

З усёй рэзкасцю трэба падкрэсліць, што ўрокі мінулага года не ўсюды ўлічаны пры падрыхтоўцы трактарнага парка да весняной пасяўной кампаніі 1934 года. Зусім нецярпімае такое становішча, калі ліквідацыйскі план рамонта трактараў выканан: па капітальнаму рамонту на 27 проц., па сярэдняму — на 19.2 проц. Трэба ў бліжэйшым-жа часе пакончыць з гэтым адставаннем. Палітаддзелы павінны выявіць і прыцягнуць да суровай адказнасці вінаватых у зрыве рамонта трактарнага парка.

Конь у спалучэнні з трактарам вырашаюць поспех весняной пасяўной кампаніі. Палітаддзельцы павінны за зіму аўладаць тэхнікай догляду каня. Выпучэнне дастатковага фуражнага фонда, падбор конюхаў, арганізацыя ўдарніцтва і стаханаўства ў кожнай стайні і брыгадзе — вось што вырашае поспех справы.

Багаты ўраджай гэтага года стварае ўсе ўмовы для магутнага ўздыма калгаснай жыццёдзейнасці. Палітаддзелы, якія забяспечылі сваім кіраўніцтвам і дапамогай поспехі ў галіне паляводства, павінны разам з падрыхтоўкай да сяўбы з не меншай энергіяй узняцца за жывёлагадоўлю. Рашэнне партыі і ўрада аб ліквідацыі бескаровасці сярод калгаснікаў з'яўляецца рашучым крокам па шляху да калгасная заможнасці. Правядзенне гэтага важнейшага мерапрыемства павінна спрыяць развіццю і далейшаму росту калгаснай жывёлагадоўлі. Вось чаму баявым абавязкам і справай гонару кожнага палітаддзела з'яўляецца супроць XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП поўнай ліквідацыяй бескаровасці сярод калгаснікаў.

Пастаянная вытворчая калгасная брыгада, расстаноўка сіл укутры брыгады, узняцце адказнасці і матэрыяльнай сацыяльнасці кожнага калгасніка адыгралі рашаючую ролю пры правядзенні пасяўной і ўборачнай. Лист брыгадзіра к-са «Нямойта», Санкенскага р-на, які сёння нам друкуецца, паказвае, што ў некаторых мясцах правільную арганізацыю працы, узмацненне брыгады разумеюць, як сезонную справу.

Неадкладная задача палітаддзелаў — зараз-жа узяцца за ўмацаванне пастаянных калгасных вытворчых брыгад. Брыгада на чале з брыгадзірам павінна адказваць і за ссыпку і за захаванне насенных фондаў, за станосішча конскай цягавай сілы, за своечасовы і добраякасны рамонт інвентара.

Рэалізуючы пастанову ЦК ВКП(б) аб перабудове партыйнай работы на вёсцы палітаддзелы здолелі ператварыць вясковыя ячэйкі ў сапраўдных арганізатараў калгаснай вытворчасці. Далейшая задача палітаддзелаў — вышэй узняць арганізуючую ролю нізавых партаўтвенняў у практычным ажыццяўленні палітыкі партыі на вёсцы. Узняўшы яшчэ больш ідэйны ўзровень і класавую пільнасць членаў партыі і комсомольцаў, палітаддзелы павінны дапамагчы ім згуртаваць вакол сябе і выхаваць моцны калгасны актыў, заваяваць большасць у калгасах і рушыць калгасныя масы на барацьбу за далейшы ўздым калгаснай вытворчасці, за большэвіцкія калгасы і заможнае культурнае жыццё.

Выкананне ўсіх іншых задач забяспечыць нам рашаючую перамогу ў барацьбе за высокі ўраджай будучага года, за далейшы росквіт калгаснай вытворчасці, за асваенне ўсіх пераваг социялістычнай сельскай гаспадаркі. Перамогі на гэтых асноўных важнейшых участках да весняной пасяўной кампаніі будуць лепшай гаварэвай сустрэчай надыходзячых з'ездаў нашай партыі.

ЦК ВЛКСМ—тав. КОСАРЭВУ

ГЕНЕРАЛЬНЫ САКРАТАР ЦК ВЛКСМ тав. **КОСАРЭЎ**

Любімаму кіраўніку шматмільённай комсомоліі, лепшаму сталінцу, нашаму Косарэву комсомолія Беларусі ў дзень свайго пятнаццацігоддзя шле палкае комсомольскае прывітанне.

Гераічныя старонкі барацьбы і перамог, упісаныя комсомолам Беларусі на франтах грамадзянскай вайны, у гераічных будніх вялікай социялістычнай будоўлі, ёсць рэзультат кіраўніцтва нашай партыі, правадыра і настаўніка сусветнага пролетарыята тав. **Сталіна,** розультат аперацыйнага, канкрэтнага большэвіцкага падтрымання і дапамогі, якую нам аказаў і аказвае ЦК ВЛКСМ і асабіста ты, тав. Косарэў.

Толькі партыя большэвікоў, выпеставаная Леніным, Сталіным, можа выхаваць такіх самаадданых большэвікоў-ленінцаў, як ты, тав. Косарэў, які сваёй работай, сваім кіраўніцтвам заражаеш нас воляй і энергіяй да перамог на ўсіх франтах будаўніцтва социялізма.

Ленінскі комсомол Беларусі заўсёды быў і будзе разам з шматмільённым комсомолам Саюза ў перадавых радах барацьбітоў за справу Леніна-Сталіна, за справу сусветнай пролетарскай рэвалюцыі.

Мы запэўняем цябе, а ў тваёй асобе і ўвесь Цэнтральны Камітэт, усю комсомолію Саюза, што тваё ўказанне «мацаваць социялістычную гаспадарку і абарону Совецкай Беларусі — заходняга фарпоста СССР — непакрушальнай крэпасці социялізма» з'явіцца для нас штодзённай баявой праграмай нашай работы. Мы будзем змагацца за тое, каб гэта ўказанне з гонарам выканаць.

Мы запэўняем цябе, што і надалей пад неаслабным кіраўніцтвам нашай партыі і правадыра тав. Сталіна, пад кіраўніцтвам ЦК ВЛКСМ, які ўзначальваеш ты, мы пойдзем ад перамогі да перамогі ў ажыццяўленні ленінскай нацыянальнай палітыкі, у будаўніцтве нацыянальнай па форме і социялістычнай па зместу культуры.

Мы клянемся выхаваць з сябе стойкіх барацьбітоў за пролетарскі інтэрнацыяналізм, за сусветную пролетарскую рэвалюцыю, за генеральную лінію нашай партыі.

Няхай жыве арганізатар і кіраўнік шматмільённага ВЛКСМ — партыя Леніна і правадыр сусветнага пролетарыята тав. **Сталін!**

Няхай жыве шматмільённы ленінскі комсомол СССР!

Няхай жыве ЦК ВЛКСМ і лепшы сталінец — наш Косарэў!

ЮБІЛЕЙНЫ ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ

Дом культуры ўпрыгожан па-святочнаму. Вялікая зала перапоўнена комсомольскім актывам. А 7-й гадзіне вечара адкрываецца ўрачысты пленум ЦК ЛКСМБ.

Па баках сцэны яркім святлом гараць літары «XV».

Пятнаццаць год — знаменальная дата ў гісторыі комсомола Беларусі. Яркай уступнай прамовай, ілюструючай асноўныя этапы барацьбы ЛКСМБ за справу социялізма, тав. **ГЕРЦОВІЧ** адкрывае ўрачысты пленум.

Створаны і выхаваны партыяй комсомол на ўсіх этапах барацьбы за справу социялізма даказаў сваю самаадданасць партыі Леніна-Сталіна. Многія тысячы працоўнай моладзі са зброяй у руках уліваліся ў рады нашай гераічнай РСЧА, змагаліся, не шкадуючы ні сіл, ні жыцця, пад баявымі чырвонымі штандарамі.

Вялікая роля комсомола ў социялістычным будаўніцтве. Мы знаходзімся на рубяжы ў капіталістычным Захадам. Гэта абавязвае нас яшчэ больш напружваць энергію, лепш, больш чотка працаваць, усямерна ўзмацняць абароназдольнасць БССР — фарпоста Совецкага Саюза.

Пасля ўступнага слова выбіраюцца ў прэзідыум пленума бюро ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ т. т. **Гікало, Косарэў, Галадзед, Шаранговіч, Жэброўскі, Рыскін, Лычоў, Чэрвякоў, Сахарава, Конік, Ратнек, Картукоў,** прадстаўнік ленінградскага абкома ВЛКСМ тав. **Вайшля,** сакратар зах. абкома ВЛКСМ т. **Чорны,** тав. **Убарэвіч, Смірноў, Закоўскі, Шораў, Радзін, Наумаў,** прадстаўнік падшэфнага лінкора «Парыжская комуна» т. **Фамічоў, Клімковіч, А. Александровіч,** т. т. **Кудзелька, Гершон, Малеў, Шугай, Гершон, Джэлюк, Досін, Асташко** і інш.

З'яўленне ў прэзідыуме т. т. **ГІКАЛО і КОСАРЭВА** пленум сустракае бурнай авацыяй.

У гапаровы прэзідыум выбраны т. т. **Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Орджанікідзе, Постышаў, Куйбышаў, Кіраў, Кэсіор, Андрэеў, Мікаян, Рудзутак, Гамарнік, Крупская, Гікало, Косарэў, Чэмадданаў, Анцілаў, Тальман, Дзімітраў, Торглер, Ленскі і Корчык.**

Ад імя ЦК ВЛКСМ з прывітаннем выступіў тав. **КОСАРЭЎ.** Характарызуючы ролю комсомола Беларусі ў социялістычным будаўніцтве, тав. Косарэў падкрэсліў, што ЛКСМБ у барацьбе за ажыццяўленне задач партыі іншоў не ў апошніх радах. Комсомол вялікую ролю адыгрывае і ў інтэрнацыянальным выхаванні рабочай і працоўнай моладзі.

З прывітальнай прамовай ад імя ЦК КП(б)Б выступіў тав. **ГІКАЛО.**

— 15 год існавання ЛКСМБ, — гаворыць тав. Гікало, — сунадае з 15-годдзем КП(б)Б і БССР. Калі азірнуцца назад, дык відавочна, якая вялізарнейшая работа праароблена за гэты час, якія вялізарнейшыя поспехі дасягнуты. Былая царская калонія — Беларусь — з усім варварскім класавым і нацыянальным уціскам у мінулым, за 15 год воляю пролетарыята і нашай партыі ператворана ў адну з перадавых квітнеючых эканамічна і культурна рэспублік Совецкага Саюза.

Гэтыя поспехі дасягнуты пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК ВКП(б) на чале з геніяльным правадыром тав. **СТАЛІНЫМ,** пры ўсеагульнай дапамозе рабочага класа Совецкага Саюза.

Далей тав. Гікало спыняецца на памылках, якія дапушчаны былі ў мінулай рабоце партыйнымі арганізацыямі Беларусі ў ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі партыі, мерапрыемствах па выпраўленню гэтых памылак і заваструе ўвагу пленума на чарговых задачах комсомольскай арганізацыі Беларусі.

Пасля агалашэння прывітання тав. Закоўскага нач. паграмчасцей АДПУ т. Радзін зачытаў загад аб узнагародзе т. т. **Косарэва і Герцовіча** шчавай ганаровых чэкістаў. З адказным словам выступіў тав. **Косарэў.**

З вялікай прамовай на пленуме выступіў старшыня СНК БССР тав. **ГАЛАДЗЕД.** У сваёй прамове т. Галадзед спыніўся на канкрэтных задачах комсомола Беларусі ў барацьбе за баявую сустрэчу XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б).

Ад імя комсомола і ўсёй рабочай моладзі горада Леніна пленум вітаў сакратар Ленінградскага абласнога і гарадскога камітэтаў ВЛКСМ тав. Вайшля.

Агалошаны прывітальныя тэлеграмы тав. **Гамарніка, Эйдэмана,** Маскоўскага абкома і гаркома ВЛКСМ і інш. Затым слова атрымлівае тав. **Ратнек.** Ён коратка падвёў вынікі папярадняй работы палітаддзелаў МТС у БССР (на пленуме прысутнічаюць усе начальнікі і памочнікі палітаддзелаў) і спыніўся на ролі і задачах комсомола.

Сакратар Заходняга абкома ВЛКСМ тав. **Чорны** ў сваёй прывітальнай прамове асабліва падкрэсліў тое, што і БССР, і Заходняя вобласць адстаюць па ільназагатоўках. Таму неабходна 15-гадовы юбілей ЛКСМБ правесці так, каб мабілізаваць сілы на ліквідацыю гэтага адставання, каб справай даць адказ на заклік тав. **Гікало** па мабілізацыі комсомола на ільназагатоўкі.

Пленум віталі: прадстаўнікі «Парыжскай комуны», дышамаўцы, піонеры, пагранічнікі і прадстаўнік комсомола Заходняй Беларусі і інш.

Пленум паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК ВКП(б) т. **Сталіну,** ЦК КП(б)Б тав. **Гікало,** ЦК ВЛКСМ тав. **Косарэву,** тав. **Чэмадданаву, Закоўскаму,** лінкору «Парыжская комуна», маскоўскаму комсомолу, комсомолу Заходняй вобласці, рэспубліканскай камісіі па чыстцы — **Лычоў і Сахаравай,** вышэйшай школе АДПУ, «Комсомольской правде» і інш.

У заключэнне пленум пастанавіў мабілізаваць 100 чалавек з ліку дэлегатаў і накіраваць у Суражскі, Сіроцінскі і інш. адстаючыя па ільназагатоўках раёны.

Пасля гэтага пленум закончыў сваю работу.

ПРЫВІТАННЕ ЦК КП(б)Б—КОМСОМОЛУ

ЦК КП(б)Б ШЛЕ ПАЛКАЕ БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ ЛЕНІНСКАМУ КОМУНІСТЫЧНАМУ САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ У ДЗЕНЬ ЯГО СЛАЎНАЙ ПЯТНАЦЦАТАЙ ГАДАВІНЫ.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ КОМСОМОЛ БЕЛАРУСІ ЎПІСАЎ ГЕРАІЧНЫЯ СТАРОНКІ Ў ГІСТОРЫЮ БАРАЦЬБЫ ПРАЦОЎНЫХ БССР ЗА СПРАВУ ПРОЛЕТАРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ, ЗА СПРАВУ СОЦЫЯЛІЗМА. КОМСОМОЛЬЦЫ БЕЛАРУСІ НА СПРАВЕ ДАКАЗАЛІ СВАЮ АДДАНАСЦЬ ПАРТЫІ НА ЎСІХ УЧАСТКАХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ І ПАКАЗАЛІ НЕ МАЛА БОЛЬШЭВІЦКІХ УЗОРАЎ РАБОТЫ. КОМСОМОЛ БЕЛАРУСІ ПА ПРАВУ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ГОНАРАМ КП(б)Б, ЯЕ ВЕРНЫМІ НАДЗЕЙНЫМ РЭЗЕРВАМ.

ЛЕНІНСКІ ЦК ВКП(б) І ГЕНІЯЛЬНЫ ПРАВАДЫР ПАРТЫІ І РАБОЧАГА КЛАСА ТАВ. СТАЛІН ВУЧЫЛІ І ВУЧАЦЬ ПАРТЫЮ І КОМСОМОЛ З ЛЕНІНСКАЙ НЕПРЫМІРЫМАСЦЮ, З КЛАСАВАЙ НЯНАВІСЦЮ ДА ВОРАГАЎ ПАРТЫІ ЗМАГАЦЦА ЗА ГЕНЕРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ, ЗА ЧЫСТАТУ РАДОЎ ВЯЛІКАЙ ВКП(б), ЗА ЖАЛЕЗНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ, ЗА БОЛЬШЭВІЦКУЮ МАНАЛІТНАСЦЬ І АДЗІНСТВА НАШАЙ ПАРТЫІ.

КОМСОМОЛ ПАВІНЕН І ДАЛЕЙ ЗМАГАЦЦА ЗА ЛІНІЮ ПАРТЫІ ТАК, ЯК ГЭТАМУ ВУЧЫЦЬ НАС НЕ ПЕРАЎЗОЙДЗЕНЫ ПАСЛЯДОЎЦА ВЛАДЗІМІРА ІЛЬЧА, ЛЕПШЫ З ЛЕПШЫХ ЛЕНІНЦАЎ—ТАВ. СТАЛІН. КОМСОМОЛ АБАВЯЗАН З УЛАСЦІВАЙ ЯМУ ЭНЕРГІЯЙ І КЛАСАВАЙ НЯНАВІСЦЮ ЯШЧЭ БОЛЬШ, ЯШЧЭ МАЦНЕЙ БІЦЦА ЗА ГЕНЕРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ НАШАЙ СЛАЎНАЙ ПАРТЫІ, ЗА ЧЫСТАТУ СЦЯГА МАРКСА-ЛЕНІНА-СТАЛІНА, СУПРОЦЬ МАЛЕЙШЫХ СПРОБ РЭВІЗАВАЦЬ ГЕНЕРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ, СУПРОЦЬ СПРОБ ЗАПЛЯМІЦЬ ГЭТЫ БАЯВЫ, НЕ ВЕДАЮЧЫ ПАРАЖЭННЯ СЦЯГ БОЛЬШЭВІЗМА.

ТАВ. СТАЛІН ВЫСУНУЎ ЗАДАЧУ ДАПОЎНІЦЬ ПАФАС НАШАГА БУДАЎНІЦТВА ПАФАСАМ АСВАЕННЯ НОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, ПАСТАВІЎ ЗАДАЧУ АЎЛАДАННЯ ТЭХНІКАЙ.

КОМСОМОЛ ПАВІНЕН ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫКАНАННЕ ПРАМФІНІЛАНА, ЗА ПАЛЯПШЭННЕ ЯКАСЦІ ПРАДУКЦЫІ, ЗА АЎЛАДАННЕ ТЭХНІКАЙ, ЗА АСВАЕННЕ НОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ. **ВЫКАНАЦЬ УКАЗАННЕ ПРАВАДЫРА ПАРТЫІ І РАБОЧАГА КЛАСА—НЯМА БОЛЬШ ГАНАРОВАЙ ЗАДАЧЫ ДЛЯ КОМСОМОЛА.**

ПРАВАДЫР І НАСТАЎНІК НАШАЙ ПАРТЫІ—ТАВ. СТАЛІН ПАСТАВІЎ ЗАДАЧУ ЗРАБІЦЬ УСЕ КАЛГАСЫ БОЛЬШЭВІЦКІМІ, А ЎСІХ КАЛГАСНІКАЎ ЗАМОЖНЫМІ, ЁН ПАСТАВІЎ ЗАДАЧУ ПАВЯЛІЧЫЦЬ УДВАЯ, УТРАЯ ВЫПУСК ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ.

КОМСОМОЛ ПАВІНЕН, НЕ СПЫНЯЮЧЫСЯ НА ДАСЯГНУТЫХ ПОСПЕХАХ, ЯШЧЭ МАЦНЕЙ, ЯШЧЭ ЭНЕРГІЧНЕЙ У КАЛГАСЕ, У БРЫГАДЗЕ, ЗВЯНЕ, НА КОЖНЫМ ДРАБНЕЙШЫМ УЧАСТКУ РАБОТЫ БІЦЦА ЗА ВЫКАНАННЕ ГЭТАГА БАЯВОГА УКАЗАННЯ ТАВ. СТАЛІНА. **КОМСОМОЛ ПАВІНЕН** ПАКАЗВАЦЬ ПРЫКЛАД І ЎЗОРЫ ТАГО, ЯК УМЕЮЦЬ КОМСОМОЛЬЦЫ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ НАШАЙ ПАРТЫІ ЗМАГАЦЦА ЗА БОЛЬШЭВІЦКІЯ КАЛГАСЫ, ЗА ЗАМОЖНАЕ, КУЛЬТУРНАЕ КАЛГАСНАЕ ЖЫЦЦЁ, ЗА ПОЎНУЮ І Ў ТЭРМІН ЗДАЧУ ІЛЬНУ, ЗА ЛЕПШУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ ЗІМОЎКІ ЖЫВЁЛЫ, ЗА ДОВРАГА КАЛГАСНАГА КАНЯ, ЗА ЗДАРОВЫ ТРАКТАРНЫ ПАРК ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

ЛЕНІН І СТАЛІН ВУЧЫЛІ І ВУЧАЦЬ НАС БЕРАГЧЫ ЯК ВОКА ЗАВАЯВАННЕ ОКЦЯБРА, УСЯМЕРНА ЎМАЦОЎВАЦЬ МАГУТНАСЦЬ НАШАЙ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ, ГЕРАІЧНАЙ, НЕПЕРАМОЖНАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, ПІЛЬНА САЧЫЦЬ ЗА СВЯТАСЦЮ І НЕДАТЫКАЛЬНАСЦЮ НАШЫХ СОВЕЦКІХ РУБЯЖОЎ.

КОМСОМОЛ ПАВІНЕН ПАСТАЯННА БЫЦЬ ГАТОВЫМ ПЕРАТВАРЫЦЬ Ў ЖЫЦЦЁ ЗАВЕТ ТАВ. СТАЛІНА: «І АДНОЙ ПЯДЗІ ЧУЖОЙ ЗЯМЛІ НЕ ХОЧАМ, АЛЕ І СВАЁЙ ЗЯМЛІ, І АДНАГО ВЯРШКА СВАЁЙ ЗЯМЛІ НЕ АДДАМО НІКОМУ». КОМСОМОЛ АБАВЯЗАН, ВЕДУЧЫ ЗА САБОЙ ШЫРОКУЮ РАБОЧА-КАЛГАСНУЮ МОЛАДЗЬ, АЎЛАДАЦЬ ВАЕННАЙ ТЭХНІКАЙ І БЫЦЬ ГАТОВЫМ Ў ЛЮБУЮ ХВІЛІНУ ПА ЗАКЛІКУ ПАРТЫІ ГРУДЗЬМІ АДСТАЯЦЬ ССР — ВАЦЬКАЎШЧЫНУ МІЖНАРОДНАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА. УМАЦОЎВАЦЬ ШЭФСТВА НАД МОРСКІМ І ПАВЕТРАНЫМ ФЛОТАМ, НАД ВАРТАВЫМ СОВЕЦКАГА ПАГРАНІЧЧА, БЫЦЬ САПРАЎДЫ МАГУТНЫМ РЭЗЕРВАМ РСЧА—ПЯРВЕЙШЫ АБАВЯЗАК КОМСОМОЛА І КОЖНАГА КОМСОМОЛЬЦА.

ЛЕНІН І СТАЛІН ВУЧЫЛІ І ВУЧАЦЬ НАШУ ПАРТЫЮ І КОМСОМОЛ БАЯВОМУ ПРОЛЕТАРСКАМУ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ, БОЛЬШЭВІЦКАМУ ВЫРАШЭННЮ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПЫТАННЯ. АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЧЫ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ПАЛІТЫКУ ЛЕНІНА-СТАЛІНА, ГРОМЯЧЫ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНЫ ШАВІНІ

На пастановы пленумаў ЦК КП(б)У і ЦК КП(б)Б працоўныя БССР адказваюць павышэннем тэмпаў і якасці работы

Выступаўшыя падкрэслілі важнасць і своячасовасць рашэнняў пленумаў

ВІЦЕБСК. (Ад наш. кар.). 15 снежня на шкіпнай фабрыцы «Профінтэрн» адбыўся адкрыты партыйны сход, прысвечаны абмеркаванню рашэнняў апошніх пленумаў ЦК КП(б)У і ЦК КП(б)Б па нацыянальнаму пытанню.

Загалоўк культурна гаркома КП(б)Б тав. Фрэйдзін у сваім дакладзе ясна і выразна растлумачыў рабочым сутнасць рашэнняў пленумаў даў грунтоўны аналіз контр-рэвалюцыйнай дзейнасці беларускіх і украінскіх буржуазных нацыяналістаў і іх агентаў у партыі—нацыянал-шпартуністаў.

Па дакладу тав. Фрэйдзіна разгарнулася актыўныя спрэчкі. Выступаючыя таварышы падкрэслівалі важнасць і своячасовасць рашэнняў пленумаў аб тым, што ў БССР як і на Украіне, на дадзным этапе галоўную небяспеку представляе мясцовы нацыяналізм, які змыкаецца з імперыялістычнымі інтэрвентамі.

За апошні час на фабрыцы мелі месца шавіністычныя вылазкі з боку асобных рабочых і работніц. Расцэньваючы гэтыя вылазкі, як дзейнасць класавага ворага, пралезшага на фабрыку з мэтай врыва выканання вытворчага плана, выступаючыя адзначасова падкрэслівалі зусім слабую работу партканцэлярыі па інтэрнацыянальнаму выхаванню рабочых.

Схіл аднадушна ўхваліў пастановы пленумаў, поўнасцю далучыўся да іх і даручыў бюро партканцэлярыі і цэхавым парт'ячэйкам яшчэ глыбей разгледаваць гэтыя пастановы ў цэхах, партгрупах і ў сетцы партасветы.

Са свайго боку сход абавязаўся ўзмацніць барацьбу з пралетарскім нацыяналізмам, шавінізмам усіх колераў, асабліва з вылазкамі вялікадзяржаўных шавіністаў, як, дадаўшы галоўны агонь на беларускаму буржуазнаму нацыяналізму.

АДНАДУШНА ЎХВАЛЯЮЦЬ ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМА

ОРША. (Ад наш. кар.). Нізавыя партыйныя звенні калгасаў воны Аршанскай МТС пачалі распрацоўку пастаноў пленумаў ЦК КП(б)У і КП(б)Б нізавых партарганізацый і калгасны актыў аднадушна ўхваляюць рашэнне пленума ЦК КП(б)Б аб тым, што на даным этапе на ўмовах Савецкай Беларусі галоўнай небяспекай з'яўляецца беларускі нацыянал-дэмакратызм.

Вось што сказалі ўдзельнікі схода калгаса «Зара свабоды» ў сваёй рэзалюцыі:

«... Нам давялося быць сведкамі таго, як прыхільнікі праводзілі сваю шкодніцкую дзейнасць. Гэта яны—прадазныя лакеі беларускага фашызма—«самлаўнараскоўвалі» нас на пасёлкі цы хутары, пасаджалі сваю апору—кулакоў; гэта яны ўсе сілы прыкладалі да таго, каб не дань нам абіраць у калгасы, каб аслабіць нас, падкопаць пад бот ідэалогіяў.

«... Нацкам не на нутру тое, што мы—працоўнае сялянства—аб'ядналіся ў калгасы, што мы пад кіраўніцтвам нашай большэвіцкай партыі на аснове суцэльнай калектывізацыі ліквідуем кулака як клас і шыляжа крочым да заможнага жыцця... Ужо ў гэтым годзе мы атрымалі на адзін працадзень па 3.500 гр. абожжа і 10 кіло бульбы. Нашы лепшыя ўдарнікі сталі заможнымі...».

«... Але мы на гэтым не супакоімся, па-баявому падрыхтуемся да 17-га з'езда ВКП(б) і 15-га з'езда КП(б)Б і нанясем моцны ўдар ахвосцю нацдэмаўшчыны павышэннем ураджаю будучага года...».

Па сходзе было адзначана, што калгас ужо закончыў здачу ільну, осыпку і дасрэтаванне насеннага страхавога фондаў.

Сход узяў на сябе рад абавязацельстваў па падрыхтоўцы ўгнаення, захаванню каня і г. д.

Тут-жа, на сходзе было абгаворана пытанне аб бескароўных. Нарашылі з 8-ёх бескароўных чатырох—лепшым ударнікам Філіпавай Наталі, Бабкову Сяргею, Шыкову Ціхону і Сямёнавай Маніі—даць цёлак з фермы, а астатнім—у другую чаргу.

Райкомам ЛКСМБ, райпракурорам, Леспрамгасу

Неадкладна ўключыцеся ў фонд дапамогі лесазмазцы, абвешчаны ЦК ВЛКСМ, пракуратурай Саюза і Наркамлесам. 20 снежня сілами комсомола і райпракуратуры сушэсна з леспрамгасамі правяцце праверку выканання пастановы СНК Саюза, заключэння дагавораў в калгасамі, аднасобнікамі на лесазагатоўку і вывазку, рэальнага вывазу, незалежна ад таго, аб якой вёсцы, аб якой грамадскай фармацыі ідзе гутарка. Паглядзіце на цяперашняга беларуса-калгасніка і вы пераканаецеся, наколькі змяніла і ціка гучаць словы аб капулях, пасах, жычках і г. д.

Нацыянал-дэмакраты імкнуліся ўсе сілы прыкласці беларусізавать цэлы рад раёнаў і абласцей РСФСР і УССР. Калі ў 1920 годзе, падтрымліваючы планы імперыялістаў, яны сцвярджалі, што граніцы Беларусі знаходзяцца ў 280 клм. ад Масквы і што «Беларусь праграмуе сабой найбольш выгодны плацдарм для нападу на большэвіцкую Маскву», то ў момант умацавання савецкай улады ў Беларусі яны, у спіну тагдашніх мерзкавышаў, не маглі выступіць з такоднага рода патрабаваннямі. Адбываецца змена тактыкі. Аперы тыя рассуждэнні аб захвале тэрыторыі БССР і УССР змяняюцца разгаворамі аб беларусізацыі часткі абласцей і раёнаў, не ўваходзячых у склад Беларускай ССР.

У «Малой Советской Энциклопедіі» дасведчаецца да таго, што «у сменавых з Беларусіяй раёнах РСФСР, ам да верхоўя Волгі (г. Ржаў) і Брянска, таксама як і ў межах Украіны (паўночныя раёны Чарнігаўшчыны і Вальні) таксама жыве значная частка беларусаў».

Праф. Бугук пад простую дыктоўку Лёгкаў, Ластоўскіх, Пецра шкінскіх распрацаваў лінгвістычную карту Беларусі, а вядомы нацдэм Сголч апіселіў і геаграфічную карту, у якой даказваў, што граніцы Беларусі дасягаюць да Вязьмы, Брянска, Чарнігава і г. д. Па гэтых картах нацдэмы ў школах, ВНУ, тэхнікумах выхоўвалі моладзь. Нацыяналістычным ядам нацдэмы атручвалі вучнёўскую моладзь, імкнуліся прывіць ёй нацыяналістычны дух.

І гэтыя нацдэмаўскія «тэзісы» зараз свабодна гуляюць у выданнях БСЭ і МСЭ. Карыстаючыся прыгнечаннем класавай пільнасці, нацдэмаўскія кантрабандысты выбралі энцыклапедыі трыбунай для папулярызацыі сваіх контррэвалюцыйных ідэй.

Як гэта ні смешна, але і зараз у энцыклапедыі такая характарыстыка беларускага насельніцтва:

«Жывуць яны невялікімі пасёлкамі, раскіданымі сярод лясоў і балот. Хата з бярвенняў, у асобных аруб, крыта дранню, або саломай, сустракаюцца да гэтага часу курныя хаты (без дымавой трубы)».

Тут мы сутыкаемся не з простым наведаннем сапраўднасці, а са свядомым не скажэннем. Зараз ужо ўсім вядома, што ў БССР процант калектывізацыі сельскай гаспадаркі дасягае звыш 52-х. Сельская гаспадарка аснашчана навейшай тэхнікай. Звыш 3.000 трактараў абгазнуюць калгасныя палі. Ліквідавана непісьменнасць. Увядзена ўсеагульнае навучанне для працоўных, выраслі новыя фабрыкі і заводы. Пры дапамозе пролетарыята СССР Беларусь стала краінай аграрна-індустрыяльнай. Вось што зараз характарызуе, а не «мілыя» сэрцу нацдэмаў прынцыпаўскія пасёлкі.

На фоне бясспрэчнага роста эканомікі Беларусі расце і культура, нацыянальная па форме і сацыялістычная па зместу. Дасягнулі ВНУ і БТНУ, сотні тэхнікумаў, Акадэмія навук з яе шматлікімі навукова-даследчымі інстытутамі—вось што зараз характарызуе культурны рост Савецкай Беларусі.

Вырасла і пролетарская літаратура. Саюз савецкіх пісьменнікаў Беларусі ядае ваякі сабе вялікі пісьменніцкі творы ажыў. З кожным днём павялічваецца ў колькасных і якасных адносінах твораў савецкіх пісьменнікаў. Расце ўплыўная працыя. Пісьменнікі ўпчыльную нацыйшлі да практычнага вырашэння праблемы стварэння «магчымітабудуе літаратуры». Савецкая паэзія Беларусі выйшла за межы БССР. Лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў перакладзены на многія мовы народаў СССР.

Пастанова ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый выклікала новую хвалю творчага энтузіязма сярод пісьменнікаў. Пераважная большасць савецкіх пісьменнікаў Беларусі цалкам усю сваю работу пачынаюць задачам сацыялістычнага будаўніцтва. Сваёй работай яны ліквідуюць фаз дакасваюць беззаветную адданасць ленінскай партыі. Гэта бясспрэчна.

Нацдэмаўскае ахвосце і тут працуе ўзяць рэваншам свае страчаныя пазіцыі. Усім вядомы рэвалюцыйныя нацдэмаўскія выступленні С. Баранавых, Нікановіча, Сідаронкі-Пенаўчіна і г. д., якія ў сваіх творах праслаўлялі працягнуць на старонках савецкага друку нацдэмаўскі хлам. Гэтыя спробы нацдэмаў партыяй былі выкрыты і разбіты.

Аднак па сённяшні дзень на старонках літаратурнай энцыклапедыі папулярызуюцца ў цэнтрыкрытай форме нацдэмаўскія тэоры.

Вядомы нацыянал-дэмакратыст (б. культурны ЦК) А. Сенкевіч у сваім артыкуле ў МСЭ піша: «Перапрыемствы па ўзнаўленню беларускай культуры і знаёмкі разбіваюць халадок недавер'я ў асяроддзі беларускіх пісьменнікаў да палітыкі совецкіх і компартыі».

Больш наглае цверджанне цяжка сабе ўявіць. Бо аб якім недавер'і і аб якіх пісьменніках ідзе гутарка? Лепшая частка совецкіх пісьменнікаў з першых-жа дзён уключылася ў будаўніцтва сацыялізма. Частка буржуазна-нацыяналістычнай інтэлігенцыі аказалася па той бок барыкады. Партыя і совецкая ўлада ў сваіх мерапрыемствах ніколі не выходзілі з таго, каб «разбіць халадок недавер'я» гэтай групы нацыяналістычнай інтэлігенцыі. Мы ўвесь час трымалі і трымаем курс на тое, каб разбіць за кавіца іх контр-рэвалюцыйныя ўстаноўкі, паказаць іх шкоду перад шырокімі масамі працоўных.

У МСЭ вельмі ідэалізуецца група нацыяналістычнай інтэлігенцыі, зусім не ўскрываецца характар іх нацыяналістычных шкодніцтваў.

У гэтай-жа МСЭ нацдэм Жылуновіч піша: «Ужо ў 1921 г. з'яўляецца А. Александровіч, А. Дудар, М. Зарэцкі. Іх малая творчасць насычана рэвалюцыйнымі мелодыямі і цалкам прысвечана апяванню Кастрычніка». Што датычыць А. Александровіча, то яго паэзія працягваў лае сабой адну з найбольш яскравых рэвалюцыйных старонак у скарбніцы малодой беларускай совецкай літаратуры. Але аб астатніх двух гэтага ні ў якай меры сказаць нельга. Дудар, а таксама Зарэцкі ні ў якай меры не апраўдваюць той характарыстыкі, якая дана ім Жылуновічам у МСЭ. Даволі ўспомніць такія контр-рэвалюцыйныя творы, як «Вецер з усхода» Дудара, «Пацарожка на новую зямлю» Зарэцкага, каб зразумець, што такая творчасць дыша нянавісцю да совецкай улады і партыі, што яна адбівае ў сябе ўсе контр-рэвалюцыйныя планы нацыяналдэмакратаў. І гэтыя пісьменнікі нічога агульнага не маюць з большэвіцкім пісьменнікам т. Александровічам. Але для Жылуновіча гэта зусім натуральна свядома скрыўляць рэчаіснасць—такі ўжо лёс нацыяналіста.

Зразумела каму гэта на руку. Нахабнасць нацыянал-дэмакратаў даходзіць да таго, што на старонках «Литературной энциклопедіі» папулярызуецца як «революцыйны паэт і пісьменнік» адары ты агент польскай дэфензывы Алехновіч.

«Драматычная паэзія прадстаўлена, галоўным чынам, Ф. Алехновічам. Яго твору належыць рад драматычных твораў бытавога зместа: «На Аканомі», «Бутрым Вымера», «Матыка», «Кагісь», «Чорт і баба», «Страхі жыцця» і інш.»

Каму патрэбна падобная ідэалізацыя агента дэфензывы. Як вядома, Алехновіч за контр-рэвалюцыйную дзейнасць быў высланы за межы БССР. А зараз на старонках манархічнага віленскага «Слова», на старонках фашысцкай газеты «Беларуская крыніца» Алехновіч вылівае цэлы памыі на совецкую рэчаіснасць. Гэты шпіён у энцыклапедыі фігуруе, як народны паэт-драматург.

У той-жа «Літаратурнай энцыклапедыі» адзначаецца, што «разам з ростам мастацкай літаратуры значнае развіццё працягваюць літаратурная крытыка і белетрыстыка. М. Багдановіч, В. Ластоўскі, А. Навіна (нацыянал-фашысты), Лушчэвіч, агент дэфензывы.—А. І. і А. І.), М. Пётуховіч, В Дзержынскі, і інш. выступілі з крытычнымі артыкуламі па пытаннях беларускай літаратуры. У публіцыстыцы найбольш відае месца займае А. Навіна».

Зноў такі «свояя своих познаша». Зноў знаёмыя твары — Ластоўскі, Лушчэвіч (Навіна), Дзержынскі (Чарнякоўскі) — агенты польскай дэфензывы. Частка з іх у Салаўках, а частка заграніцай вядзе антысовецкую работу.

Трэба проста сказаць, што на старонках «Литературной энциклопедіі» пахабна ідэалізаваліся контр-рэвалюцыянеры і шпіёны.

Нова патрэбы прыходзіць нацпэлы рад вытрымак з «Большой», «Малой» і «Литературной энциклопедій». І так зусім ясна, што гэтыя артыкулы напісаны пад дыктоўку нацдэмаў, або самымі нацыянал-дэмакратамі. Гэтыя артыкулы прадстаўляюць сабой адкрытую прапаганду нацыянал-дэмакратычных установак, якія дадзным дадзены разбіты партыяй.

Прыходзіцца адзначыць таму, што да гэтага часу гэтыя артыкулы не былі падвергнуты крытыцы з антысовецкіх. Значная віна за гэта падае на беларускія навучовыя таварыствы арганізацыі, якія павінны былі выкрыць гэту нацдэмаўскую кантрабанду.

Горацкі раён абавязан неадкладна ліквідаваць свё адставанне па ільназагатоўках

АРГАНІЗАЦЫЯМІ КРУГЛАСУТАЧНАЙ АПРАЦОЎКІ ІЛЬНУ, БЕСПЕРАБОЙНАГА ВЫВАЗУ ГАТОВАЙ ВЫСОКАЯКАСНАЙ ПРАДУКЦЫІ НА ПРЫЁМАЧНЫЯ ПУНКТЫ—ДАБІЦЦА ХУТЧЭЙШАГА ЗАВЯРШЭННЯ ІЛЬНАЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ ПА УСЕЙ РЭСПУБЛІЦЫ

БЕЗ БАЯВОЙ АРГАНІЗАВАНАСЦІ...

ГОРКІ. (Ад наш. кар.).

Пастановай рэспубліканскай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю ГОРАЦКІ раён ганесці на чорную дошку. На працягу двух апошніх год раён не вылазіць з прарываў, амаль па кожнай кампаніі ён пяцнецца ў хвосце адсталых раёнаў рэспублікі.

Нядаўна прайшоўшая чыстка партыі паказала, што адна з прычын такога ганебнага становішча заключалася ў засмечанасці раённай парт арганізацыі. Кулацкія элементы ў горацкай партарганізацыі знялі сабе моцнае гняздо. Чысткай выключана з партыі 190 чалавек або 31,4 проц. усёй партарганізацыі. У ліку выключаных—8 членаў раённага камітэта партыі—перарадзіцелі, прамыя агенты кулака.

Надзвычайная засмечанасць партарганізацыі совецкіх органаў (РВК, міліцыі, сельскіх саветаў) давала сябе адчуваць ва ўсёй рабоце раёна.

Новае раённае кіраўніцтва, правільна зрабіўшы ўпор на перабудову работы партарганізацыі, на выкананне абожжа і бульбапаставак дапрыкане не мабілізавала, аднак, партарганізацыю і шырокія масы калгаснікаў і аднаасобнікаў на баявое выкананне апрацоўкі і загатовак ільну.

Рад калгасаў раёна да здачы ільну і не прыступіў.

— Пасцеем лён і ўзімку апрацаваць,—разважае старшыня калгаса «Адказ шкоднікам» (Шарынскі сель совет).

Такія разважанні характэрны не толькі для гэтага калгаса, але і для многіх іншых. У некаторых калгасах імкнуцца апраўдацца адсутнасцю рабочых рук для апрацоўкі ільну. А на справе ў комуне «Чырвоная зорка» з 50 жанчын на ільне працуе толькі 6; у комуне «Беларусь» з 50 працуе каля 10. Такіх прыкладаў можна прывесці шмат.

Неарганізаванасць работы ў калгасе, адсутнасць барацьбы з кулацкім сабатажам ільназагатовак—вось другая прычына таго, што раён ашыўся на чорнай дошцы.

Круглясутачная работы па апрацоўцы ільну ў раёне яшчэ няма, уся свабодная рабочая сіла ў калгасах (уключаючы і мужчын, якіх трэба было пераключыць на сушку, сартаванне і мяцце ільну) не скарыстоўваецца.

Райспажыўсаюз (старшыня т. СУРПІН) зусім не дапамагае ў арганізацыі круглясутачнай апрацоўкі ільну. Да гэтага часу калгасы не забяспечаны газай. Пасобныя калгасы вымушаны апрацоўваць лён пры лучыне, што ні ў якім разе нельга дапускаць, улічваючы небяспеку пажара. Шматлікія скаргі на адсутнасць газы не турбуюць кіраўніцтва райспажыўсаюза.

Загатлён, які павінен адыгрываць рашаючую ролю ў планаванні і кіраўніцтве ільназагатоўкамі ў раёне, фактычна існуе толькі як тэхбаза. Кіраўніцтва райзагатільня бездапамоснае, мала ініцыятыўнае. Прамта варыя, якія ёсць у распараджэнні Загатільня для кантрактантаў, на пункты паступаюць несваячасова. 624 метры мануфактуры і 136,5 метра палатна для бялізны ляжалі 4 дні без руху на базе райспажыўсаюза, у той час як на месцах у гатых таварах адчуваецца вострая патрэба.

У выдачы прэміяльных тавараў кантрактантам існуе агідлівейшая ўраўнілаўка. Тавары выдаюцца ўсім аднолькава, незалежна ад колькасці і якасці здаваемага валакна.

Класавы ворат у ільназагатоўках праўдзе асаблівую «актыўнасць». Старшыня калгаса «Калгаснік Беларусі» Лабусаў Спіпан, выконваючы волю кулацтва, разагнаў сход калгаснікаў, на якім заключалася соцспаборніцтва на датэрміновую апрацоўку ільну. Аб гэтым абурачым факце сігналізавала раёнгазета. Яна патрабавала ад раённага пракурора прыцягнення кулацкага агента Лабусава да адказнасці. Прайшло больш трох тыдняў, Лабусаў працягвае сваю шкодніцкую дзейнасць: лён ляжыць, апрацоўка зрываецца. А пракурор тав. ДЫКМАН? Ён маўчыць, быццам яго гэта не датычыць.

* * *

Горацкі раён мае ўсе магчымасці выканаць поўнасцю план ільназагатовак. Трэба толькі пераключыць усю партарганізацыю на барацьбу за лён, мабілізаваць шырокія масы калгаснікаў вакол гэтай важнейшай кампаніі.

Неабходна перайсці на сутачныя заданні калгасам па апрацоўцы і здачы ільну, забяспечыць круглясутачную работу сушыльных і мяльных пунктаў, расставіць сілы так, каб кожны насельніцкі пункт быў уцягнут у актыўную барацьбу за лён, у барацьбу з кулацкім сабатажам.

Гэта зрабіць можна. Для гэтага патрэбна штодзённае аперацыйнае кіраўніцтва, правільная расстаноўка партыйна-комсомольскіх сіл, скарыстанне 22 делегатаў двух усебеларускіх з'ездаў калгаснікаў-ударнікаў (аб іх у раёне забыліся) і ўсяго актыва.

Яўх. Гольдшварц.

ЗВОДНА АБ ХОДЗЕ ІЛЬНАЗАГАТОВАК ПА БССР

на 15 снежня 1933 года ў процантах

ПА ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАХ

№ п/п	Раён	Загатоўлена ўсяго валакна	Сялянская валакна	Ільнатрасты
1.	Дрысенскі	88,3	30,0	99,2
2.	Полацкі	85,1	67,3	100,1
3.	Сенненскі	77,7	62,9	87,1
4.	Шклоўскі	64,9	42,0	84,7
5.	Бялыніцкі	59,3	42,5	71,6
6.	Бешанковіцкі	53,5	56,2	54,9
7.	Асвейскі	54,5	90,1	43,9
8.	Расонскі	53,6	52,6	52,7
9.	Ушацкі	53,2	29,1	90,8
10.	Чашніцкі	50,3	36,2	68,8
11.	Дуброўенскі	49,7	43,1	56,3
12.	Оршанскі	49,0	55,2	40,8
13.	Гарадоцкі	47,6	43,1	51,9
14.	Віцебскі	47,3	54,2	44,0
15.	Крупскі	45,4	34,0	130,8
16.	Лепельскі	45,3	38,3	50,9
17.	Лёзненскі	41,1	35,2	46,6
18.	Чашускі	30,9	57,5	23,7
19.	Талачынскі	35,3	61,9	22,0
20.	Горацкі	29,3	27,1	100,0
21.	Мсціслаўскі	26,2	27,7	23,3
	Разам па ільнаводчых раёнах	51,1	42,5	59,2

ПА НЕІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАХ

№ п/п	Раён	Загатоўлена ўсяго валакна	Сялянская валакна	Ільнатрасты
1.	Старобінскі	85,2	85,2	—
2.	Ч.-Слабодскі	79,4	79,4	—
3.	Смалявіцкі	63,9	63,9	—
4.	Слуцкі	62,5	62,5	—
5.	С.-Дарожскі	61,7	61,7	—
6.	Хойніцкі	61,2	61,2	—
7.	Біцебскі	55,4	55,4	—
8.	Пухавіцкі	54,0	59,1	50,6
9.	Капыльскі	51,8	51,8	—
10.	Любаньскі	51,8	51,8	—
11.	Барысаўскі	51,2	51,2	—
12.	Асіпавіцкі	51,1	51,1	—
13.	Аршанскі	50,9	55,2	29,7
14.	Рагачоўскі	50,5	48,7	51,4
15.	Бабруйскі	48,8	75,3	29,3
16.	Бярэзінскі	48,5	48,5	—
17.	Глускі	46,9	46,9	—
18.	Чэрвенскі	46,6	46,6	—
19.	Бягомльскі	44,7	44,7	—
20.	Заслаўскі	43,5	43,5	—
21.	Мазырскі	41,4	41,4	—
22.	Уздзенскі	41,1	41,1	—
23.	Чэрыкаўскі	39,6	39,6	—
24.	Жлобінскі	38,0	38,0	—
25.	Быхаўскі	37,9	37,9	—
26.	Парыцкі	37,8	37,8	—
27.	Чачэрскі	37,7	35,5	—
28.	Касцюковіцкі	37,3	33,6	70,8
29.	Турэўскі	36,7	36,7	—
30.	Рэчыцкі	36,3	36,3	—
31.	Крычаўскі	34,1	24,6	53,2
32.	Лагойскі	33,4	33,4	—
33.	Кармянскі	32,8	24,9	37,4
34.	Жыткавіцкі	30,0	30,0	—
35.	Б.-Кашалёўскі	28,8	28,8	—
36.	Веткаўскі	27,5	27,5	—
37.	Менскі	25,5	25,5	—
38.	Ельскі	25,2	25,2	—
39.	Далгжынскі	25,1	25,1	—
40.	Камарынскі	23,6	23,6	—
41.	Плешчаніцкі	23,2	23,2	—
42.	Брагінскі	22,9	22,9	—
43.	Клічаўскі	22,9	22,9	—
44.	Ч.-Польскі	22,4	17,8	24,4
45.	Тарахоўскі	20,8	56,1	4,4
46.	Петрыкаўскі	20,3	20,5	—
47.	Магілёўскі	20,4	35,9	5,6
48.	Прапойскі	18,6	18,6	—
49.	Нараўлянскі	17,3	17,3	—
50.	Лоеўскі	16,6	16,6	—
51.	Гомельскі	14,4	14,4	—
52.	Лельчыцкі	13,9	13,9	—
53.	Уваравіцкі	13,4	13,4	—
54.	Клімавіцкі	13,2	13,2	—
	Разам па неільнаводчых раёнах	33,7	32,2	—
	Разам па БССР	46,6	40,7	55,7

ПАЛАЖЭННЕ АБ ПРАКУРАТУРЫ САЮЗА ССР

Асноўны напрамак работы пракуратуры ўстаноўлен законам 20-га лістопада 1933 г. «Аб устанаўленні пракуратуры Саюза ССР». Палажэнне аб пракуратуры, зацверджанае прэзідыумам ЦВК, развівае гэты напрамак.

Асноўнай задачай пракуратуры Саюза, як вызначыў прэзідыум ЦВК, з'яўляецца ўмацаванне сацыялістычнай законнасці і ахова грамадскай уласнасці ад замахаў з боку антыграмадскіх элементаў на ўсёй тэрыторыі Саюза ССР.

Пракурор ажыццяўляе нагляд за тым, каб пастановы і распараджэнні ведамства Саюза ССР і саюзных рэспублік і мясцовых органаў улады адпавядалі канстытуцыі Саюза і пастановам і распараджэнням урада Саюза.

Ён наглядае за правільным і адзінстайным прымяненнем законаў судовымі ўстановамі. Пракурор мае права трэбаваць для прагляду судовыя і следчыя справы ў любой стадыі правядзення, уключаючы ўжо закончаныя справы і апратэстоўваць пры гаворы і рашэнні суда ў вышэйстаячыя інстанцыі, прыпыняць іх выкананне.

У сувязі з установай пракуратуры Саюза прэзідыум ЦВК скасаваў пракуратуру вярхоўнага суда.

Гадавое заданне выканана 11 снежня

ЦВК і СНК СССР у сваёй пастанове ад 8 снежня далі катэгарычнае ўказанне аб закрыцці ўсіх шляхоў выхада на рынак брака і некамплектнай прадукцыі. У пастанове сказана, што «кіраўнікі трэстаў, дырэктары прадпрыемстваў і асобы адміністрацыйна-тэхнічнага персанала, вінаватыя ў выпуску недобраякаснай прадукцыі, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці з прыстасаваннем меры судовай рэпрэсіі—пазбаўленнем волі на тэрмін не нізкі 5-ёх год».

На гэта гістарычнае ўказанне ўрада рад фабрык і заводаў адказалі практычнай справай—выкананнем вытворчай праграмы, палажэннем якасці прадукцыі. Рабочы калектыў магілёўскай шаўковай фабрыкі пад кіраўніцтвам сваёй партыйнай арганізацыі шырока разгарнуў спаборніцтва па датэрміновому выкананню плана. Ад спаборніцтва шаогул фабрыка перайшла к канкрэтнаму, па адна родных прафесіях. Гэта дало магчымасць палажыць у брыгадах улік выканання не толькі колькасных паказальнікаў плана, але і якасных.

У адказ на пастанову ЦВК і СНК рабочы калектыў фабрыкі вынес рашэнне поўнасцю рэалізаваць абавязацельствы, узятыя ім у сувязі з падрыхтоўкай да XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б). Фабрыка ўжо мае магчымасць фактычна выканаць на 11 снежня вытворчая праграма першага года другой пяцігодкі выканана на 100,3 проц. Па выпуску першагатункавай прадукцыі задание выканана на 100,2 проц. У соцыялістычны фонд XVII з'езда ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б фабрыка выпускае звыш плана на 2 млн. руб. прадукцыі.

Па прыкладу шаўковай фабрыкі адгукнуліся на пастанову ЦВК і СНК іншыя заводы БССР. Капыльскі кахляна-плітачны завод «Пролетарый» знізіў брак да 2,5 проц. замест планавых 7,5 проц.

Рабочы-ўдарнік Барысаўскага шклазавода імя Домбаля Пекарэвіч выклікае на спаборніцтва брыгадзіра Шчука па практычным ажыццяўленні пастановы ЦВК і СНК.

— Чытаў я пастанову пра тое, якую патрэбна нашым заводам прадукцыю выпускаць. За брак караць будуць.

— Што з таго, што ты гаварыў?—пачаў брыгадзір Малінёўскі.—А я вось выклікаю Вас паслядаваць майму прыкладу. Цэлыя боя і брака патрэбна перарабіць у сотыя.

— Ну, ну, пакажы прыклад, а мы за табой,—адказалі разам Лапіцкі, Хмара і Васілёўскі.

На другі дзень пасля работы падлічвалі вынікі дзённай выпрацоўкі. Брыгада Малінёўскага перавыканала дзённае задание, брак давяла да 0,41 проц. замест планавых 1,25 проц. Брыгада Лапіцкага таксама перавыканала задание і брак давяла да 0,18 проц., Васілёўскага—0,45 проц. Не адстала брыгада Хмары, Райкевіча і Шчукі.

Але на заводзе ёсць брыгады, якія ганебна адстаюць. Да такіх адносяцца брыгады Малёўскай, Бураковa, Гразнёўскага. Яны сістэматычна не выконваюць нормы, даюць шмат брака і боя.

Рантавы цэх віцебскай абутковай фабрыкі імя Лекерта з кожным днём набірае тэмпы ў барацьбе за палепшэнне якасці прадукцыі. Калі ў кастрычніку адхіленне ад першага гатунка было 7,4 проц., дык у лістападзе — 5,83 проц., а зараз чэх дабіўся зніжэння брака да 4 проц. (планавае задание).

З кожным днём палепшаецца якасць прадукцыі лесапільнага цэха меншага завода імя Молатава. Брыгада лепшага ўдарніка Булавы перавыконае штодзённае задание і дае высокую якасць прадукцыі.

Аднак, побач з пасяменнямі мы маем цэлы рад заводаў, якія ўсё яшчэ выпускаюць брак, не прытрымліваюцца ўстаноўленых стандартаў. Ільназаводы Белільпатрактарацэнтра выпусцілі каля 20 тысяч кгр. прадукцыі, якая не можа быць скарыстана тэкстыльнай прамысловасцю, а толькі на будаўніцтве як пакля.

Яшчэ надзвычай дрэнная якасць прадукцыі шкіпнай прамысловасці. Задание па павышэнню прадукцыйнасці працы за 10 месяцаў выканана на 73,9 проц. Сабекошт замест зніжэння (на 2,8 проц.) павялічыўся на 8,3 проц.

Пастанова ўрада не знайшла свайго практычнага праламлення на менскім хлебазаводзе. Вытворчая праграма за 10 месяцаў выканана толькі на 90,6 проц. Выпечана хлеба першага гатунку 92 проц.

Дрэнна яшчэ працуюць шкіпныя фабрыкі імя Крупскай і «Красная іголка». Гэтыя прадпрыемствы пакуль не абгаварылі пастановы ЦВК і СНК на агульных сходах рабочых. Фабрыкі па-ранейшаму псуюць сырэц, выпускаюць прадукцыю дрэннай якасці.

Асноўныя прычыны дрэннай якасці прадукцыі перш за ўсё заключаюцца ў адсутнасці канкрэтнага кіраўніцтва цэхамі, брыгадамі. Іх фармальна перавялі на гаспадарчы разрахунак, ніякага ўліку работы фабрычных арганізацый у брыгадах не відзець.

Нядаўна пры «Звязде» адбылася нарада трыкутнікаў фабрык лёгкай прамысловасці. Нарада паказала шляхі да зніжэння брака. На гэта ёсць усе магчымасці. Патрэбна толькі растлумачыць кожнаму рабочаму значэнне пастановы ўрада аб палепшэнні якасці прадукцыі.

Даць працоўным больш прадукцыі і лепшай якасці—важнейшая задача партыйных, прафсаюзных гаспадарчых арганізацый. Хто з гаспадарнікаў не разумее гэтых задач, таму прамы шлях да пракуратуры.

А. М.

А. ДЖЭЛЮК, А. ІОФФЕ

АЧЫСЦІЦЬ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ ад НАЦДЭМАЎСКАГА ХЛАМА*)

Нацдэмаўскае ахвосце, аказваецца, для апраўдання «самабытнай» гісторыі беларускага народа вывучала такія праблемы, як «Сацыяльны характар прычоскі беларуса», або «Спосабы лова жывёлы і птушак у Аршанскім раёне» і г. д.

Акадэмік Карскі ў гэтым «надзенным» тоне вывучэння жыцця і быта беларускага народа ўнёс таксама сваю лепту. Напрыклад, ён «паставіў на строга «навуковую» нагу праблему вывучэння вопраткі беларуса.

«Звычайная вопратка беларусаў у цёплы час года складаецца з белай палатнянай кашулі (сарочкі) да кален і таких-жа штанёў (порткі) з поясам паверх рубахі. У цяперашні час, — піша Карскі, — у паўднёва-заходняй Беларусі разрэз у кашулі бывае просты і вапратнік (каўпер) шырокі, адкладны, які завяжваецца чырвонай стужкай, або завяжваецца чырвонай тасемкай (жычкай)» (Карскі, БСЭ).

Смешна неяк робіцца, калі разбіраеш гэту нацдэмаўскую лухту ў «Большой Советской Энциклопедіі». Што моска быць агульнага паміж забытым селянінам беларусам, які знаходзіўся ў прыгонніцтве ў XVIII стагоддзі, і беларусам-калгаснікам цяпер? Хіба можна гэта параўноўваць зараз? Але нацдэмаўскае ахвосце хапаецца за «самабытны слушны пояс» або «самабытны фазрэз у кашулі», каб даказаць неахопнасць беларускіх рысаў, незалежна ад таго, аб якой вёсцы, аб якой грамадскай фармацыі ідзе гутарка. Паглядзіце на цяперашняга беларуса-калгасніка і вы пераканаецеся, наколькі змяніла і ціка гучаць словы аб капулях, пасах, жычках і г. д.

Нацыянал-дэмакраты імкнуліся ўсе сілы прыкласці беларусізаваць цэлы рад раёнаў і абласцей РСФСР і УССР. Калі ў 1920 годзе, падтрымліваючы планы імперыялістаў, яны сцвярджалі, што граніцы Беларусі знаходзяцца ў 280 клм. ад Масквы і што «Беларусь праграмуе сабой найбольш выгодны плацдарм для нападу на большэвіцкую Маскву», то ў момант умацавання совецкай улады ў Беларусі яны, у спі

ДА УСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЫ НАЧАЛЬНІКАЎ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ МТС

АРГАНІЗУЕМ ПЕРАМОГУ ДРУГОЙ ВЯСНЫ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

„У палітаддзельцаў ужо ёсць не малы вопыт работы, але не трэба забываць таго, чаму вучыў Ленін, вучыў і вучыць тав. Сталін: не зазнавацца, не дапускаць ніякага галавакружэння ад поспехаў. Будзем памятаць, што ўперадзе стаяць яшчэ значна больш адказныя і складаныя задачы“ (КРЫНІЦКІ)

КАМЕНШТЭЙН

Нач. палітаддзела Большэвіцкай МТС

ЗГУРТАВАЦЬ І ВЫХАВАЦЬ КАЛГАСНЫ АКТЫЎ

Восем месяцаў прайшло з таго часу, калі арганізаваўся палітаддзел Большэвіцкай МТС. Восем месяцаў нашай работы — гэта дні упартай настойлівай большэвіцкай барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, за вычышчэнне калгасаў ад кулацкіх і варагуючых элементаў.

...Партыя павінна не змяншаць, а павялічваць свае сувязі з калгасамі, яна павінна ведаць усё, што адбываецца ў калгасах, каб своечасова прыйсці на дапамогу і кіраваць калгасамі ...—гэтыя словы прав. Сталіна сталі баявой праграмай нашай работы.

З першых-жа дзён нам прыйшлося сустрэцца з упартым супраціўленнем рэшткаў разгромленага, але яшчэ моцнага кулацтва. Яны толькі метады, улоўка, манеўры і хітрыкі перамянялі кулачно, каб сарваць нашу работу.

У часе пасяўной кампаніі ворагі імкнуліся дыскрэдытаваць звышплановую сяўбу, дабіваўся змяншэння норм высеву і ніжэйшай якасці ворыва.

Летам клясавы вораг прабаваў усімі спосабамі сарваць поліва, спекулюючы на канцэнтрацыйных пазіцыях і адстаўленасці пасобных калгасаў.

У часе жніва ўраджаю кулачно мабілізавала свае сілы, каб сарваць уборку, каб адарваць яе ад малацьбы і інш.

Асабліва ўпартае супраціўленне аказалі варожыя элементы пастаўкам збожжа дзяржаве і спалучаюць натуралаты. Былі пучкаты ў ход усе спосабы: тут і падрыў працоўнай дысцыпліны, агітацыя за невыход на работу, распаўсюджанне пробна-буржуазных тэорый, па шырэнне чутак аб вайне і г. д.

Палітаддзел МТС перш па перш мабілізаваў калгасныя масы на барацьбу з мянёўрамі клясавага ворага.

Па канкрэтных прыкладах мы выкрывалі тактыку кулацтва, паказвалі сапраўдны твар клясавага ворага. Палітаддзел згуртаваў вакол сябе моцны калгасны актыў, пры дапамозе якога былі выкрыты і выкінуты з калгасаў варожыя, чужыя элементы.

Гэта было наша першачарговае мерапрыемства ў галіне арганізацыйна - гаспадарчага ўмацавання калгасаў.

Палітаддзел выразна расставіў партыйныя сілы ў калгасах: арганізавана 8 калгасных ячэек, 3 кандыдацкія групы, 7 партыйна-комсомольскіх ядраў, у 22 калгасах створан інстытут парторгаў; адноўлены кіруючыя кадры праўленняў рада калгасаў. На чале вытворчых участкаў МТС пастаўлены члены партыі.

У разультаце раней адставаўшыя калгасы «Трудавік», «Трэці рашаючы», «Першая конная» і інш. выйшлі ў рады перадавікоў.

Індывідуальныя і групавыя гутаркі, брыгадныя і звенневыя вытворчыя нарады, чытка газет, выпуск штодзённак, чырвоная і чорная дошкі, пасылка буксірных брыгад для соцыялістычнай дапамогі адстаючым, арганізацыя інспектый па якасці з вопытных калгаснікаў, згуртаванне шырокага актыва вакол партячэек — вось метады работы вясковых большэвікоў.

Пад лозунгам тав. Сталіна аб культурным заможным жыцці мы пашлі ў масы калгаснікаў на барацьбу за ўдарную сумленную працу. Пасеялі сур'ёзны ўдар па дробна-буржуазнай разбэшчанасці, па старых дзедаўскіх традыцыях.

За мінулы час у МТС і калгасах вырас **вялікі кадр энтузіястаў-ударнікаў.** Яны вялі за сабой масы, па прыкладзе іх работы вучыліся калгаснікі.

Далейшы палітычны рост нашага актыва, нашых ударнікаў — залог сацыялістычнага перавыхавання ўсёй масы калгаснікаў. Нам трэба буйна шырэй працаваць над згуртаваннем і выхаваннем калгаснага актыва.

Бягучы год паказаў, якую рашаючую ролю адыгрывае брыгадзір у арганізацыі працы. **Брыгадзір становіцца галоўнай фігурай калгаснай вытворчасці.** Ад яго ініцыятывы, спраўкі, умення наладзіць працу, расставіць рабочую сілу, узняць энтузіязм ударнікаў, злежыць поспех усёй работы.

Возьмем для прыкладу звяе брыгады. Брыгада тав. **МАЛАШЭВІЧА** з калгаса «Першая конная» своячасова ўбрала ўраджай, не дапусціла, каб збожжа асыпалася пад дажджом, арганізавала хуткі і высакаякасны абмалот, да тэрміна скончыла пастаўкі і засыпала насенныя фонды. Брыгада пажынае цяпер плады сваёй ударнай працы. 5,5 цнтр. збожжа і 14 кгр. бульбы атрымлівае калгаснік на працадзень — у 2-3 разы больш, чым у мінулым годзе.

Брыгадзір **Пачкавец** з калгаса «Кізінтарн» дапусціў развал працоўнай дысцыпліны, дробна арганізаваў працу, запаганіў уборку і абмалот, абазвіўшы ў брыгадзе пры яго ад вялікіх страт. У выніку, не плацячы на добры ўраджай, калгаснікі атрымалі значна менш чым у суседніх гаспадарках — 2 кгр. збожжа і 2 кгр. бульбы на працадзень.

Яшчэ больш паважаць арганізуючую ролю брыгадзіра, падбіраць на пасады брыгадзіраў надзейных, адданых справе людзей, сапраўдных арганізатараў вытворчасці, — вось пытанні, якімі нам прыдзецца сур'ёзна заняцца.

Мала ўвагі аддалі мы работе па **звяневыні.** Між тым гэтыя маладыя камандзіры калгаснай вытворчасці робяць вялікую справу —ад іх залежыць вельмі многае. Нам трэба будзе выхаваць ініцыятыўных звяневых, здольных забяспечыць поспех работы на сваім участку.

«Калгас — буйная гаспадарка, але буйную гаспадарку нельга весці без плана» (Сталін.) Жыццё паказала ўсё вялізнае значэнне гэтых указанняў нашага правадыра. Вытворчы план не стаў яшчэ асновай нашай работы, а гэта вельмі шкодна адбівалася на вытворчасці. У радзе калгасаў план зрабіўся сапраўдным «фількінай граматай». Праўленні абмяркоўваліся бю разгратычным складаннем плана, не сачылі за яго выкананнем, не даводзілі яго да брыгад і калгаснікаў.

Мы павінны зараз-жа прыступіць да **складання дэтальнага вытворчага плана на 1934 год,** ахапіўшы ім усе пытанні калгаснай вытворчасці, зрабіўшы яго асновай усёй работы, здабыткам усёй масы калгаснікаў.

Вынікі нашай работы за 8 месяцаў з'явіліся дэманстрацыяй перамог новых метадаў партыйнага кіраўніцтва. На два месяцы раней, чым летась, скончана малацьба. Да 25 кастрычніка завершана ўборка бульбы, прычым уся плошча пераарана. Калгасы Большэвіцкай МТС да тэрміна скончылі пастаўкі збожжа і ягаду натуралаты, з гонарам выканаўшы свае абавязкі перад дзяржавай. Засыпаны насенныя і страхавыя фонды. Калгасы прыступілі да размеркавання ўраджаю.

Калгаснікі наглядна пераканаліся, што адзіна правільны шлях — гэта шлях, указаны ім партыяй Леніна і Сталіна, што толькі **сумленная ўдарная праца забяспечвае заможнае жыццё.**

У калгасе **«Чырвоны партызан»,** Кайкаўскага сельсовета, ізга (працадзень павысілася па збожжы з 1.2 кгр. да 5.1, па бульбе з 4 да 12 кгр.; па калгасу **«Першая конная»** па ўтрыманьню прыбылае збожжавых 5.2 кгр., замест 1,9, бульбы — 14 замест 7 кгр.

Такавы лічбы. З такімі рэзультатамі падыходзім мы да з'езду партыі. Рост матэрыяльнага дабрабыта калгаснікаў і павышэнне іх актыўнасці стварае усе прадпасылкі для разгортвання культурнай рэвалюцыі на вёсцы. Узначаліць паход за соцыялістычную культуру — наша задача.

Палітаддзел зрабіў толькі першыя крокі па шляху ператварэння нашых калгасаў у большэвіцкія, а калгаснікаў у заможных, па соцыялістычным перавыхаванню калгаснікаў. Уперадзе яшчэ вялікая работа. Трэба пакараваць энтузіязм калгасных мас на базавую падрыхтоўку да падыходзячай вясны, на заваяванне яшчэ больш высокіх ураджаяў.

ЯЧЭЙКА НА ЧАЛЕ ВЫТВОРЧАСЦІ

ЛІСТ ЧЛЕНАЎ ЯЧЭЙКІ КП(б)Б КАЛГАСА ІМЯ СТАЛІНА, ЗАПОЛЬСКАГА СЕЛЬСОВЕТА, РАГАЧОЎСКАГА РАЁНА

Мы сабраліся пісаць гэты ліст напярэдадні з'езда нашай партыі, калі з усёй відавочнасцю бачны тыя вялізныя дасягненні, якіх мы дабіліся пад кіраўніцтвам і пры дапамозе нашага палітаддзела.

Зараз, калі мы пішам гэтыя радкі, нашы калгасныя свіраны налоўнены ачышчаным праз трыер насеннем. Насенныя і страхавыя фонды ссыпаны, выходзячы з плана правой сяўбы 1933 года з набаўкай у 10 проц. на пашырэнне плошчы пасева.

Фуражныя фонды для жывёлы (як канцэнтраваныя, так і грубыя кармы) таксама створаны. Наш калгасны конь мае па 2 кіло аўса на дзень, не лічачы грубых кармоў. Насенныя фонды па актах пераданы кладаўшчыку **Мартынаву.** Догляд за іх хаваннем даручан члену праўлення **Лявочаву Янку.** За фуражныя фонды і правільнае іх выдаткоўванне адказваюць конюх **Казлоў Янка,** брыгадзір **Карчмароў Антон** і загадчык МТФ **Губскі.**

Размеркавалі мы ўраджай на працадні, выпрацаваныя да 1-га лістапада, а рэшту будзем размяркоўваць 5-га студзеня 1934 г.

Лепшыя ўдарнікі не ведалі, куды дзяваць атрыманае імі дабро. Вось калгаснік **Сцяпанаў Сямён** атрымаў 215 пудоў збожжа, 900 пудоў бульбы, ды грошай больш 600 руб. Гэта толькі па 1 лістапада, а за два месяцы сваёй работы (да 1 студзеня 34 г.) ён яшчэ атрымае дадатковa.

У дзень ураджаю і калектывізацыі мы ячэйкай сумесна з калгаснікамі параўнялі ў 1934 годзе павысіць ураджайнасць па збожжавых да 12 цэнтн. і па бульбе да 120 цэнтн. з гектара.

Лепшы ўдарнік калгаса імя Калініна (Пухавіцкага раёна) ВАСІЛЕЎСКІ Адам.

Як-жа мы зараз выконваем свае абяцанні. З чым мы сустракаем з'езды нашай партыі?

Раскажам усё падрабязна і па парадку.

Рамонт інвентара (плугі, бораны) ідзе спешнымі тэмпамі, да 20 снежня закончым. Наш каваль **Найман Ісак** даў на гэта шэрдае слова і ператварае яго ў справу —50 проц. плугоў і боран ужо адрамонтаваны. Па скапчэнні рамонта брыгадзіры: Карчмароў Антон і Краўцоў Рыгор строга справе раць, прымуць увесь інвентар і захаваюць да вясны ў падрыхтаваных свірнах.

Цяпер аб конях. У нас іх 40. Кожны конюх ведае сваю групу коней, корміць іх, поіць. Праўда, дрэнна ў нас з чысткай коняй. Зараз ужо купілі скрабніцы, будуць чысціць штодзённа. Ліквідацыя абзялічкі ў адносінах да каня адразу дала сябе знаць: коні выглядзяць сярэдняй сытасці, па жарэбнымі кабылам у нас асобны догляд, частку з іх ужо аслабанілі ад работы.

Санным шляхам вывезці ўвесь тной—вось наша рашэнне і мы яго праводзім у жыццё: вывезена 50 вазоў. Праўда, вывезлі мала, тлумачыцца гэта тым, што калгас пікі заняты вывазкай лесу па дагавору, заключанаму з леспрамгасам.

Нам адпушчан вагон мінеральных угнаенняў, як толькі вагон гэты прыбудзе на станцыю, адразу-ж пачнем яго вазіць у спецыяльна выпучанае сухое гумно; пасля мы рашылі сабраць не менш 3-х пудоў з кожнага двара. Пытанне гэтае ставілі на сходзе калгаснікаў. Зараз мабілізуем і вучняў, каб збіралі попел у скрыні ў кожнай хаце.

30 калгаснікаў запісаліся ў агратэхгурткі, 16 снежня мы атрымліваем праграму з МТС і пачынаем рэгулярна займацца. Дрэнна ў нас тое, што мы не ведаем канчатковага плана сяўбы, гэта перашкаджае нам прыступіць да складання вытворчага плана.

Работу ячэйкі нашага калгаса мы перабудавалі так: на сходах ячэйкі, дзе заўсёды прысутнічае калгасны актыў і радавыя калгаснікі, мы абмяркоўваем канкрэтныя пытанні. Вось напрыклад, што мы абгаварылі за апошні час: справаздачу кандыдата т. Мартынава аб рабоце кладовай, даклад старшыні калгаса т. Ахрамкова аб размеркаванні ўраджаю.

Да пастановы ЦК і СНК у нас было 8 бескаровных, зараз бескаровных у нас толькі адзін старшыня, які гэтымі днямі набывае сабе карову.

Спыніўся шчакльні на пытанні аб культуры ў калгасе. Мы намецілі пабудаваць у 1934 годзе лазню, клуб, устанавіць дынама-машыну, радыё, ужо не гаворачы аб прывядзенні ў культурны выгляд хат і двароў калгаснікаў, што мы ўжо зрабілі. Пабудову лазні ўжо канчаем, падвезлі матэрыял для пабудовы клуба. Рухавік адраманторан і гэтымі днямі будзе ўстаноўлен.

Калгаснікі **Хлапкоў Янак, Ластаўка Юлі** ўжо ўстанавілі радыёпрыёмнікі, многіх хат калгаснікаў цяпер не пазнаць, яны прыведзены ў культурны выгляд.

Вось коратка аб рабоце нашай калгаснай ячэйкі. Мы шмат чаго зрабілі, але добра ведаем, што галоўнае яшчэ ўперадзе. Мы ўпэўнены, што пад кіраўніцтвам палітаддзела, пры яго далейшай дапамозе сустрэнем з'езды нашай партыі новымі перамогамі.

Сакратар ячэйкі ГУБСКІ МІХАСЬ.

Члены ячэйкі: МАРТЫНАЎ АНДРЭЙ, МАКСІМАВА МАРЫНА, АХРАМКОЎ МАКСІМ. КРАЎЦОЎ РЫГОР. Спачуваючы ЛЯВОНАЎ ЯНКА.

ЧАМУ БРЫГАДЫ ПАЙШЛІ У „АДСТАЎКУ“

ЛІСТ БРЫГАДЗІРАЎ

Паведамленні аб скліканні XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б) наш калгас «Нямойта», Сенненскага раёна, спаткаў радам буйнейшых перамог.

Пад кіраўніцтвам і пры дапамозе палітаддзела намі даўно выкананы абавязацельствы па пастаўцы дзяржаве збожжа, бульбы, малака і мяса.

Не параўнаць сёлетні год з мінулым. Летась ільназагатоўкі заканчвалі ў сакавіку-красавіку, якасць валакна была нізкая — № 2, 4,6.

— Сёлета мы здалі лён дзяржаве датэрмінова, з перавыкананнем плана—138 цэнтн. турбінай трасты і 23 цэнт. валакна 8-м, 10-м, 12-м і 14-м нумарам.

Значна больш у параўнанні з мінулым годам атрымаў і калгаснік. Калі летась на працадзень прыпадала 1 з пал. кгр. збожжавых, дык сёлета па 3 кгр.

Зараз мы хочам падзяліцца на старонках «Звязды» аб тым, як мы рыхтуемся да сяўбы, аб сваіх думках і меркаваннях.

Трэба праўду сказаць,—дасягнутыя намі поспехі сяму-таму ўскружылі галаву. Людзі супакоіліся. У сапраўднасці-ж мы зрабілі толькі першы крок па шляху да заможнасці. У наступным гэдзе вага працадня павінна павялічыцца па меншай меры ў дваццаць разы. А для гэтага трэба ва што-б там ні стала адпаведна ўзняць і ўраджайнасць.

У сувязі з падрыхтоўкай да сяўбы ў нас узнікае рад важнейшых пытанняў.

Першае — план веснавой сяўбы і ссыпка насенных і страхавых фондаў. Гэта галоўнае пытанне. На жаль, трэба сказаць, што планаў сяўбы дагэтуль няма. Вось мы і думалі, як ссыпаць на сенне. Летась з планам у нас была няўвязка. Нам далі план большы, чым мы мелі зямлі. Нам вызначылі засеяць 196 гектараў, а мы калі пачалі сеяць, больш 172 гектараў, запяўшы ўвесь папар, не маглі знайсці. Гэта—вынік галавацяпства былога кіраўніцтва раённых земельных арганізацый і МТС. Нельга дапусціць такога з'явішча ў наступным годзе.

Азімых летась мы засеялі 57 гектараў, а сёлета 70. Вось выходзячы з усяго гэтага, мы і ссыпалі насення на 159 гектараў і 15 проц. страхавых фондаў. Насення хопіць. Усё насенне добра ачышчана, за выключэннем ільнянога семя. Ільнасемя часткова засмечана кустутай. Няма ў нас такой машыны, каб ачысціць семя ад кускуты. Яе трэба абавязкова набыць. Райзеаддзел і МТС павінны нам дапамагчы, бо кускута зніжае ўраджай ільну.

Другое пытанне пакоит зямлі. Мы ведаем, што зямлякарыстанне калгасаў непарушна паводле закона савецкага ўрада. Гэта правільна. Але вось як бывае: адзін калгас перагружан зямлёй, у другога мала зямлі, а яны—побач. Не трэба далёка хадзіць за прыкладам. Побач з намі комуна «Індустрыя». У комуне на калгасны двор 10 га раллі, у нас 5 гектараў, сена жаці таксама. У выніку комуна заўсёды позніцца з работамі, а нам рабіць няма чаго. Вось мы і прапануем частку зямлі ад такіх перагружаных калгасаў, па дагаворанасці па месцы і ў раёне, з зацверджання Наркамзема, перадаць малазямельным і маласенажатным калгасам. Ад гэтага і той і другі выйграе, і дзяржаве будзе больш карысці, і работа пойдзе спрытней, і якасць апрацоўкі зямлі будзе лепшая.

Трэцяе — аб вытворчай калгаснай брыгадзе і яе ўмацаванні. У нас дзве брыгады. Раней па брыгадамі былі замацаваны ўчасткі, коні, інвентар. Але пад восень усё перабыталася. Адна брыгада так часта працавала на ўчастку другой, што зараз і канцоў нельга знайсці, жая працавала лепш, якая горш. Словам, страціўся твар пастаяннай вытворчай калгаснай брыгады. І інвентар, як плугі, бораны, культыватары і цягавая сіла ўжо «абагуліліся», сталі агульнакалгаснымі, а не брыгаднымі.

Працэй кажучы, брыгадзір перастаў быць гаспадаром сваёй брыгады.

Вінаваты тут усе—і мы брыгадзіры, і праўленне калгаса, і раённыя арганізацыі, якія, часта зусім не лічачыся з брыгадзірам, ламаюць усякія брыгадныя планы, заранні. Тут праяўляецца камандаванне, якое шкодна адбіваецца на рабоце брыгады.

Чацвертае — агразоатэхвучоба. Нельга зрабіць калгас большэвіцкім, а калгаснікаў заможнымі і культурнымі, калі мы не будзем культурна весці гаспадарку. Каб культурна працаваць, трэба вучыцца. Трэба ведаць, напрыклад, на якую глыбіню, якую зямлю араць і пад якую культуру. У якой меры, напрыклад, выскваць суперфасфат, касцяную муку і г.д. Усё гэта трэба ведаць і не толькі гэта. Словам, трэба аўладаць агразоатэхнікай. А ў нас пагаварылі аб занятках, напісалі нават на паперы, вызначылі кіраўнікоў ды штосці на гэтым і замерла справа. Не думаюць, відаць у МТС і райзе маддзеле аб агратэхвучобе. Кажуць: «ільназагатоўкамі заняты». Гэта—не адгаворка. Мы патрабуем неадкладна пачаць агратэхвучобу з намі-брыгадзірамі і калгаснікамі.

Пятае — севазварот. Мы ведаем, што севазвароты важнейшы сродак культурнага вядзення буйнай калектыўнай гаспадаркі, сродак узняцця ўраджайнасці. Няма ў нас севазвароту. Праўда, жыта засеяна ў адным полі, пад лён вызначана поле, але гэта яшчэ не севазварот, бо ніхто з нас не ведае, на якім участку, што будуць сеяць. Штосці і па гэтаму важнейшаму пытанню сёлета ніхто з агранамаў з намі не гаворыць, а пара, даўно пара.

Выходзячы з свайго вопыта, мы прапануем пры ўвядзенні севазваротa вызначаць засеў занятага па пара наступнымі культурамі: 1) вікa—на сілёны корм па гною, бо вікa фыхліць клебу, як сода буль-



ДУБАВЕЦ Алесь— брыгадзір 1-й брыгады калгаса «Нямойта» Сенненскага раёна.

кі. Гэта найлепшы папярэднік для жыта; 2) ранняя бульба-скараспежка; 3) ранні ячмень з наступным угнаенням.

Нельга дапускаць такіх севазваротаў, паводле якіх асенняя сяўба па занятых яравымі папарамі цягнецца да глыбокай восені, а часамі зусім зрываецца, бо ў такіх выпадках не атрымаеш высокага ўраджаю.

Мы ўпэўнены, што па ўсе гэтыя важнейшыя нашы пытанні ў бліжэйшы час атрымаем дакладны адказ і дапамогу ў іх вырашэнні ад палітаддзела.

Пад кіраўніцтвам палітаддзела МТС і райкома партыі мы атрымаем рад буйнейшых перамог. Мы ўпэўнены, што адзначыцё XV з'езд КП(б)Б і XVII з'езд ВКП(б) мы сустрэнем новымі перамогамі ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы 1934 года.

Брыгадзіры калгаса «Нямойта»: БАСІЛЬ АЎЧЫНКА, АЛЕСЬ ДУБАВЕЦ.

Сенненскі раён.

ПЛОТКІН

Нач. палітаддзела Ветрынскай МТС

ПАЛІТАДДЗЕЛ У БАРАЦЬБЕ ЗА ЛЁН

Лён у нас — вядучая культура. 2405 га ільну засеялі вясной гэтага года калгасы, абслугоўваемыя Ветрынскай МТС.

З першага дня работы, палітаддзел узяўся за дапамогу і кіраўніцтва калгасамі ў барацьбе за стопроцантнае выкананне плана сяўбы ільну ва ўстаноўлены тэрмін.

Па старых сведаўскіх традыцыях лён тут пачынаюць сеяць тады, калі адцвіталі яблыні. Палітаддзел абвясціў рашучую барацьбу з гэтымі традыцыямі, якія скарыстоўваліся кулацтвам у яго спробах сарваць сяўбу. З 1-га па 7-е красавіка, як толькі зышоў снег, было засеяна 56 га вышпраўленага ільну і да 20-га мая —на 26 дзён раней, чым у мінулым годзе, калгасы нашай зоны скончылі сяўбу ільну і ўсіх яравых.

Да цераблення ільну ў большасці калгасаў нашай зоны прыступілі своячасова, калі лён быў у васковай спелесці, церабілі па меры паспявання асобных участкаў, не чакаючы агульнага паспявання ўсяго масіва. У аднолым калгасы нашай зоны цераблене ільну закончылі за 6-7 дзён.

Як толькі пачалося цераблене, кулакі і іх стаўленнікі ў апараце МТС, бачучы добры ўраджай ільну, разгарнулі актыўна сваю дзейнасць, накіраваную на зрыў цераблення, здачу дзяржаве добраякаснага ільну.

У першую чаргу яны павялі агітацыю супроць ільнацерабілкі «Комсомолка». Кулацкія агенты ў апараце МТС планіравалі такім чынам, што ільнацерабілку «Комсомолка» накіроўвалі ў такія месцы, дзе яна не можа работаць. Гэта была стаўка на штучную зацяжку цераблення з тым, каб лён перастоіў.

Кулацкі мянёўр шкодзілкаў палітаддзелам быў выкрыт. Пасля гэтага палітаддзел арганізаваў шэфства лепшых комсомольцаў над ільнацерабілкай «Комсомолкай». На практычнай рабоце «Комсомолкі» ў калгасе «ПРАЦА» была паказана ўсім калгаснікам выгаднасць работы ільнацерабілкі. Гэта дало магчымасць усе 29 ільнацерабілак цалкам скарыстаць, што значна скарацілa тэрміны цераблення і не дало ільну перастаяць.

Акрамя гэтага палітаддзел арганізаваў дапамогу перадавых калгасаў адстаючым.

Па ўстаноўленых нормах кожны калгаснік павінен за дзень выцерабіць 0,08 га ільну. У асобных калгасах — «Праца», «Акцябр», «Чырвоны марак» — лепшыя ўдарнікі выпрацоўвалі па 0,12—0,13 га ў дзень. Гэтыя ўдарнікі палітаддзелам былі накіраваны ў адстаючыя калгасы і яны там на практыцы паказалі, як трэба працаваць для таго, каб хуткай скончыць цераблене. Такую-ж работу палітаддзел праводзіць зараз. Лепшыя ўдарнікі і ўдарніцы па трапанню і мяцію накіроўваюцца ў адстаючыя калгасы і там паказваюць, як трэба працаваць.

Пасля таго, як увесь лён быў абмалочан і разаслан, па ініцыятыве палітаддзела ва ўсіх калгасах былі вылучаны спецыяльныя наглядчыкі за цераблічам. Гэтыя наглядчыкі штодзённа раніцой абыходзілі палі, браралі пробы і па гэтых пробах устанаўлівалася паспяваемасць ільну. Увесь лён са цераблічаў па ўсіх калгасах быў пазнят своячасова, няма ні аднаго калгаса на нашай зоне, у якімбы лён застаўся пад снегам.

Своячасовае цераблене і пазнятне са цераблічаў значна павысіла якасць атрымаемага ільну. Калі ў мінулым годзе самым вялікім нумарам здаваемага ільну быў 5.5, дык у гэтым годзе 80 проц. ільну здаецца 11-12 нумарам. Самы нізкі нумар—гэта 7 і 6.

Траста здавалася не ніжэй 1,5--1,25 нумара. Калгас «Мялешка» здаў усю трасту 2 нумарам.

Гэта давалася не так лёгка. Палітаддзел змог забяспечыць здачу высокакаякаснай прадукцыі толькі на аснове жорсткай барацьбы з кулацкім сабатажам, праводзячы шырокую масавую работу непасрэдна ў брыгадах.

Для таго, каб растлумачыць калгаснікам выгаднасць здачы ільну лепшай якасці, палітаддзел правёў тэхнічную канферэнцыю па ільну. На гэтай канферэнцыі з ільном у руках, са стандартамі ўсякіх нумараў загалчык Загатільну т. Цішкоў растлумачваў калгаснікам, колькі грошай і хлеба яны атрымаюць за кожны здаваемы кілаграм ільну розных нумара. Гэта добра дзейнічала, якасць здаваемага ільну значна павысілася.

Гадавы план здачы ільну на 10 снежня выкананы на 90,9 проц. Натур аплата па ільнатрасце выкананa на 97,1 проц. У мінулым годзе на гэта-ж чысло план загатовак быў выкананы на 30 проц.

Гэтыя поспехі калгасы нашай зоны атрымалі таму, што партыйная арганізацыя перабудавала сваю работу ў адпаведнасці з дырэктывай ЦК ВКП(б) ад 15 ліпеня г. г. Замест існаваўшых раней 9 тарытарыяльных ячэек, зараз створаны 3 калгасныя ячэйкі, 2 кандыдацкія групы. У 13 калгасах створаны партыйна-комсомольскія ядры і ў 7 вылучаны партарганізатары. З 63-х членаў і кандыдатаў партыі зоны МТС 44 непасрэдна працуюць у калгасах і брыгадах, асобныя партыйныя арганізатары сапраўды паказваюць узоры барацьбы за лён.

Кандыдат партыі калгаса **«Акцябр» ПУГАЧОЎ,** правёўшы вялікую масава-растлумачальную работу, дабіўся, што яго калгас першы ў зоне МТС скончыў здачу ільнатрасты. Уся траста здана 2 нумарам. Партарганізатар калгаса Мелешка да біўся поўнага выканання плана здачы ільнавалакна і сёлета ў параўнанні падрыхтоўкі да XVII з'езда ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б калгас здаў звыш плана 2 цэнт. ільнавалакна.

Атрыманне сцяга ЦК КП(б)Б і СНК БССР Полацкім раёнам ставіць перад нашай МТС задачу — намагчы ўсе сілы для таго, каб да 20 снежня цалкам закончыць здачу ільну і засыпаць насенне, своячасова адрамантаваць трактары, па-балшэвіцку сустрэць веснавую сяўбу 1934 г.

Работнікі палітаддзела абавязаліся яшчэ шырэй разгарнуць масава-растлумачальную работу, яшчэ больш узмацніць клясавую пільнасць, бязлітасна выкрываючы клясава-варожыя элементы з тым, каб нашу МТС, якая з'яўляецца прыгранічнай, зрабіць сапраўды ўзорнай МТС у рэспубліцы.

СКАНДАЛЬНЫ ФІНАЛ ЛЕЙПЦЫГСКАГА СУДЗІЛІШЧА

Абвінавачанне разбіта па ўсіх пунктах

ВЫСТУПЛЕННЕ ТОРГЛЕРА

ЛЕЙПЦЫГ, 17 снежня (БЕЛТА).

Торглер заяўляе, што ў пракурора не было ніякіх падстаў патрабаваць для яго кары смерці, бо ён зусім невінаваты.

Торглер даказвае, што ён нічога не ведаў аб рыхтуючымся пажары і калі-б ведаў, дык прыняў-бы ўсе меры для таго, каб перашкодзіць пажару, бо вельмі добра ўсведамляў, што ноты пажар можа быць накіраваны толькі супроць компартыі.

«Я, — заявіў Торглер, — буду дакажа сваёго жыцця змагацца за сацыялізм, але я лічу, што тэрарыстычныя акты, падпалы не могуць быць сродкам барацьбы рабочага класа».

Торглер падкрэслівае, што германская компартыя вяла энергічную барацьбу супроць тэрарыстычных настрояў і ўказвае, што лозунг «Бі фашыстаў, дзе іх не сустрэнеш», які адзін час высоўваўся компартыяй, паняволі разумецца ў сваёе палітычнай, а не фізічнай барацьбы з прадпрыемцамі. Паколькі, аднак, — гаворыць Торглер, — існавала небяспека няправільнага тлумачэння гэтага лозунга, компартыя скасавала гэты лозунг і выступіла супроць яго».

Торглер адкідае абвінавачанне компартыі, нібыта яна ў лютым 1933 г. падрыхтоўвала ўзброенае паўстанне.

«Тады, — гаворыць Торглер, — не было ніякіх прадпасылак да падобнага акта. Я ўжо спасылаўся на словы Леніна, што без прадпасылак было-б злачынствам, авантурызмам ісці на паўстанне».

Торглер заяўляе далей, што неза доўга да пажара рэйхстага была склікана канферэнцыя прадстаўнікоў прэсы, у тым ліку і прадстаўнікоў замежнай прэсы. На гэтым сходзе выступіў Пік. Адзін буржуазны журналіст запытаў Піка, што намерана прадпрыняць компартыя ў выпадку сваёй забароны. Пік адказаў, што компартыя намерана заклікаць рабочы клас да абароны партыі.

«Я вельмі добра ведаў палітычную сітуацыю. У той перыяд многа гаварылася аб рыхтуючымся замаху на Гітлера. Калі мне стала вядома, што распускаюцца падобныя чуткі, я сказаў аб гэтым у адной са сваіх прамоў. Я ведаў, што калі-б адбылося што-небудзь падобнае, дык гэта было-б скарыстана, як повад для забароны компартыі.

Адзін з кіраўнікоў «Сталёвага шлема» перадаў мне наступны разгавор паміж віднымі палітычнымі дзеячамі:

— Калі будуць унутраныя ўскладненні, компартыя павінна быць забаронена, — сказаў адзін з іх. Другі запытаў: «А калі компартыя не падпасна на правакацыю?» Тады першы адказаў: «Мы створым гэтыя ўскладненні».

«Пры такіх умовах, — заяўляе Торглер, — хіба можна сабе ўявіць, што калі-б да мяне прышоў Ван дэр-Люббе і павёў разгавор аб падпале рэйхстага, я стаў-бы яго слухаць? Не. Я зрабіў-бы ўсё, каб вы крыць яго і абараніць інтарэсы комуністычнай партыі.

У заключэнне Торглер заяўляе:

«Тут разбіралася пытанне аб спробе компартыі арганізаваць адзіны рабочы фронт, і гаварылася, што гэта рабілася ў сувязі з рыхтуючымся комуністычным паўстаннем. Гэта не верна. Пытанне аб адзіным рабочым фронце было высунута значна раней і не толькі з прыходам да ўлады Гітлера.

Яшчэ ў 1923 г. компартыя пачала выдаваць журнал «Адзіны фронт». Гэта даўняе імкненне компартыі. Я заяўляю, што не маю ні малейшых адносін да падпала рэйхстага. Ван дэр-Люббе я ўпершыню ўбачыў у палітэй-прэзідыуме 8-га лютага.

Я зусім невінаваты».

Старшыня абвяшчае працэс закончаным і паведамляе, што судовы прыгавор будзе абвешчан 23-га снежня ў 9 гадзін раніцы. Перад закрыццём пасяджэння старшыня ўказвае, што, не гледзячы на яго прапанову, каб ні замежная, ні германская праса не прадвыракалі пастанову суда, падобныя факты мелі месца не толькі ў замежнай, але і ў германскай прэсе. Старшыня заяўляе, што гэтыя спробы прадвырашыць прыгавор не аказваюць уплыву на рашэнне суда.

„Берлінер берзен цэйтунг" прызнае поўны правал абвінавачання

БЕРЛІН, 17 снежня (БЕЛТА).

Амаль увесь германскі друк устрымліваецца ад каментарыяў да спрэчак бакоў і апошніх слоў абвінавачаных. Асабліва характэрна, што замест прамовы Дзімітрава газеты друкуюць толькі злобныя выпады супроць гэтай прамовы, упікаючы нават прыводзіць хоць-бы выгрымкі з яе.

Лейпцыгскі карэспандэнт «Берлінер берзен цэйтунг», піша, што «з дзяржаўна-палітычных перакананняў было-б пажадана, каб суд часцей абрываў прамову Дзімітрава, чым гэта рабілася».

Аднак, «БЕРЛІНЕР БЕРЗЕН ЦЭЙТУНГ» ВЫМУШАНА ТАКСАМА ПРЫЗНАЦЬ ПРАВАЛ АБВІНАВАЧАННЯ СУПРОЦЬ ТОРГЛЕРА пасля таго, як ужо сам пракурор распісаўся ў сваім банкрутстве ў адносінах абвінавачаных балгар.

Газета піша, што адвакат Зак «па майстэрску абверг» сцвярджэнні абвінавачання аб віне Торглера. «Цяпер, — піша газета, — не можа быць больш сумневаў, што пасля таго, як Зак рассеяў апошнія падазрэнні адносна віноўнасці Торглера, ён будзе апраўдан па справе аб падпале рэйхстага. Рэплікі пракурора супроць Зака зрабілі слабае ўражанне».

«Фактычна, — гаворыць далей газета, — вярхоўны пракурор сваёй заявай, што Торглер «у той ці іншай форме» прымаў удзел у падпале, толькі сам пацвердзіў, што няма аб'ектыўных доказаў віноўнасці Торглера».

«Берлінер берзен цэйтунг» патрабуе, каб пасля апраўдання Торглера па гэтай справе вярхоўны суд неадкладна ўзбудзіў новую справу па абвінавачанню «у замаху на звяржэнне існуючага лада», не толькі супроць Торглера, але і супроць Тэльмана і іншых лідэраў германскай компартыі».

ВЫСТУПЛЕННІ ПАПОВА І ТАНЕВА

ЛЕЙПЦЫГ, 17 снежня (БЕЛТА).

Пасля Дзімітрава апошняе слова даецца ПАПОВУ. Папоў указвае, што ён — член балгарскай компартыі і што з-за палітычнай дзейнасці яму прышлося стаць эмігрантам.

«Як у Балгарыі, — гаворыць Папоў, — так і за граніцай я займаўся толькі балгарскімі справамі, і з гэтай мэтай я прыехаў сюды.

Я не прымаў ніякага ўдзелу ў германскім палітычным жыцці і не знаходзіўся ні ў якой сувязі з германскай компартыяй. Я не прымаў удзела ў падпале рэйхстага і не мог прымець па наступных прычынах: я не правакатар, не авантурыст і не путчыст.

У заключэнне Папоў гаворыць:

«Я не вінавот. Няма і не можа быць ніякіх момантаў падазрэння. Мы павінны быць апраўданы не таму, што няма дастатковых доказаў аб нашай віноўнасці, а таму, што мы павінны быць прызнаны зусім невінаўнымі. Доказаў нашай віноўнасці няма і быць не можа».

ТАНЕЎ у сваім апошнім слове ўказвае, што ён член ЦК балгарскай компартыі, член палітбюро, па даручэнню якога ён вядзе за грані цай работу па пытаннях балгарскай эміграцыі.

Ён заяўляе:

«Я, зразумела, не быў звязан з германскай компартыяй, не прымаў удзела ў палітычным жыцці Германіі і не меркаваў удзельнічаць у ёй у будучым.

Прыбыўшы ў Берлін за два дні да пажара я, зразумела, не мог быць у рэйхстаўзе. Я заяўляю, што з такім тыпам, як Ван дэр-Люббе, не мог быць звязан ні адзін балгарскі комуніст».

Танеў патрабуе, каб ён, як і ўсе іншыя комуністы, быў поўнасцю апраўдан.

ЯК ФАБРЫКУЕЦЦА ІНФАРМАЦЫЯ АБ СССР

ВЫКРЫТАЕ МАШЭННІЦТВА

У рыжскіх газетах 5-га снежня была надрукавана папыраная латвійскім тэлеграфным агенцтвам «тэлеграма ТАСС'а» з Масквы ад 4-га снежня, у якой паведамлялася, быццам ДПУ арыштавала 8.500 чалавек. У тым ліку тысячу «ўрадавых чыноўнікаў, афіцэраў і салдат Чырвонай арміі».

Усе гэтыя асобы нібыта належалі да патаемнай тэрарыстычнай арганізацыі, якая наладжвала падпалы складаў ваенных прыпасаў, узарвала склад баявых прыпасаў у Благавешчанску і абіралася ўзарваць важныя совецкія дзяржаўныя будынкі.

Само сабой зразумела, што ўся гэта тэлеграма з'яўляецца **ГРУБАЙ ФАЛЬШЫЎКАЙ** і што ТАСС такога і наогул падобнага паведамлення не распаўсюджваў і не мог распаўсюджваць.

Белагвардзейская газета «Сегодня» апублікавала гэту фальшыўку вялікімі літарамі на першай старонцы разам з пераладным артыкулам, у якім, між іншым, пісала, што:

«Можна лічыць найбольш праўдападобным», што «паведамленне адносіцца да совецкага Далёкага Ўсходу».

Пры гэтым пераладны артыкул прыводзіць густы букет друкаваных за апошні час у розных антысовецкіх выданнях вымышленых паведамленняў аб паўстаннях і парты занскай вайне на нашым Далёкім Усходзе, аб падпалах і ўзрывах ваенных складаў і г. д. Нават рэдакцыя гэтай белагвардзейскай газеты агаварвала, што прыведзенае ёй тлумачэнне мнімага паведамлення ТАСС'а з'яўляецца «дапушчэннем».

Гэта, аднак, не перашкодзіла рыжскаму карэспандэнту «Таймс», які набыў сумную міжнародную вядомасць сваёй «інфармацыяй» аб СССР, паслаць тэлеграму, якая з'явілася ў «Таймсе» ад 5-га снежня, дзе побач з перадачай зместа падложнай тэлеграмы ТАСС'а, без спасылкі на газету «Сегодня» прыводзілася цытаванае вышэй тлумачэнне гэтага паведамлення ТАСС'а, аднак, ужо не як «найбольш праўдападобная» камбінацыя ці як «дапушчэнне», а са спасылкай на «даставерныя весткі з неафіцыяльных крыніц».

Тут-жа, падобна газеце «Сегодня» карэспандэнт прыводзіў доўгі пералік вымыслаў аб усялякіх жахах на совецкім Далёкім Усходзе, выдаючы іх тым самым за інфармацыю з «даставерных» крыніц.

Неадкладна пасля атрымання вестак аб з'яўленні падложнай тэлеграмы ТАСС паслаў пратэст дырэкцыі Латвійскага тэлеграфнага агенцтва, а таксама патрабаваў апублікавання афіцыяльнай заявы, што ТАСС падобнай тэлеграмы не пасылаў, што аб акалічнасцях апублікавання гэтай «тэлеграмы» будзе праведзена падрабязнае расследванне і што вінаватыя панясуць належную кару.

У адказ на гэта дырэкцыя Латвійскага тэлеграфнага агенцтва ў пісьме на імя ТАСС'а, выказваючы жаль па поваду здарыўшагася, паведаміла, што з'яўленне названай тэлеграмы тлумачыцца непаразуменнем, што станаграфістка запісваўшая радыё, не дачула і г. д.

У адказ на патрабаванне ТАСС'а аб апублікаванні Латвійскім тэлеграфным агенцтвам, што ТАСС не пасылаў яму падобнай тэлеграмы. ЛТА пераслало газетам раз'яснение, што «афіцыяльна тэлеграфнае агенцтва спасылку на ТАСС у тэлеграме, выпушчанай ЛТА, не давала» і што з-за кепскай перадачы ў стэнаграму папала слова «ТАСС». Гэта раз'яснение было надрукавана ў адной рыжскай газеце «Социял-дэмократ».

ТАСС.

НОТА ПОЛЬСКАГА ЎРАДА ЗЛУЧАНЫМ ШТАТАМ

ВАРШАВА, 17 снежня (БЕЛТА).

Польскі ўрад адправіў ураду ПАЗШ ноту ў сувязі са скарачэннем 15-га снежня тэрміна плацяжа па ваенных даўгах. У ноце падкрэсліваецца, што польскі ўрад не можа плаціць чарговы ўнос з тых-жа прычын, якія былі ўказаны ў польскай ноце ПАЗШ у снежні 1932 г.

Адпачасова нота заяўляе аб гатоўнасці польскага ўрада выступіць да перагавораў аб урэгуляванні пытання аб ваенных даўгах. 15-га снежня Польшча павінна была ўплаціць ПАЗШ 1.393 тыс. даляраў у кошт амартызацыі капітала і 3.559 тыс. даляраў процантаў па капітальнаму доўгу.

„ЛОГІКА" ПАРЫЗІУСА

ЛЕЙПЦЫГ, 17 снежня (БЕЛТА).

Пасля прамовы адваката Зака бакі абменьваюцца рэплікамі. Пракурор Парызіус у сваім адказе адвакату Тэйферту зноў настойвае, што падпал рэйхстага не мог быць зроблен адным чалавекам.

Парызіус далей заяўляе, што такі чалавек як Ван дэр-Люббе, зрабіў шы 4 падпалы, павінен быць прызнан сацыяльна-небяспечным і павінен быць назаўсёды выведзен з грамадства.

Парызіус настойвае, што ўчынкам Ван дэр-Люббе кіравалі палітычныя матывы і што падпал рэйхстага быў сігналам да паўстання.

Пракурор Вернер настойвае на сваёй прапанове ў адносінах Торглера. Аднак, ён зноў прызнае, што судовану следству не ўдалося ўстанавіць, у якой форме выявіўся ўдзел Торглера ў падпале рэйхстага. Ён прызнае, што асноўным довадам, якога аргументацыі з'яўляюцца паказанні нацыянал-социялісцкага дэпутата Карване, якія, на яго думку, судовым следствам не абвергнуты. Адсюль ён робіць літаральна наступны «лагічны вывад». «Калі Ван дэр-Люббе і Торглер адмаўляюць, што яны былі разам і гутарылі ў будынку рэйхстага, адсюль а неабходнасцю выцякае, што яны гаварылі аб арганізацыі падпала рэйхстага.

На ўказанне Зака, што сляды суўдзельнікаў не знойдзены, пракурор заяўляе: «Калі гэтых слядоў не ўдалося знайсці, дык тлумачыцца гэта тым, што «чалавечыя сілы абмежаваны».

Адвакат Зейферт падтрымлівае сваю аргументацыю, указваючы, што версія пракуратуры аб акалічнасцях пажара і аб суўдзельніках Ван дэр-Люббе грунтуецца не на фактах, а на дапушчэннях.

З рэплік адваката Зака трэба адзначыць прыведзеную Закам вытрымку з паказанняў Карване на судзе, якая яўна даказвае прадуманасць гэтага сведкі.

Зак зачытвае наступнае месца з паказанняў Карване: «Калі-б тады, калі я сустрэў Ван дэр-Люббе і Торглера, мне запыталі — ці іншы гэтыя людзі сапраўды разам, я адказаў-бы, што не магу гэтага сцвярджаць, але цяпер вядома сапраўднае становішча рэчаў, вядома, што яны былі суўдзельнікамі». Суд пераходзіць да заслухоўвання апошніх слоў падсудных.

Учора рабочыя Менска не атрымалі ні адной шуркі дроў

Патрабуем ад пракуратуры прыцягнення вінаватых да судовай адказнасці

Учора, 18 снежня, Менск атрымаў 98 вагонаў дроў, з іх у адрас гартопа 66 вагонаў. Тым не менш, з прычыны злачынна нядбайных адносін работнікаў склада і транспартных арганізацый да сваіх абавязкаў, РАБОЧЫЯ МЕНСКА НЕ АТРЫМАЛІ НІ АДНОЙ ШУРКІ ДРОЎ. Праўда, першы эшалон, № 857, прыбыў са спазненнем: замест першай гадзіны ночы — у 12 г. дня. Разгрузка цягнулася паўтары-дзве гадзіны. Можна было паспець вылажыць дровы ў шуркі і раздаць іх пайшчыкам. Аднак, не складзе НЕ АКАЗАЛАСЯ ЛЮДЗЕЙ ДЛЯ ЎКЛАДКІ ДРОЎ, НЕ АКАЗАЛАСЯ І ГУЖТРАНСПАРТА. Прымацаваная да склада ў дапамогу ўкладцы дроў калгасная школа ГАРЗА парашыла зрабіць дзень адпачынку, а гартоп не здагадаўся на гэты дзень знайсці ІНШЫХ РАБОЧЫХ. Дырэктар гужпарка БАГДАНОВІЧ і старшыня арц. «Чырв. транспартнік» ПЕРСКІ таксама нагадзілі дзень адпачынку, НЕ КЛАПОЦЯЧЫСЯ АБ ВОСТРАЙ ПАТРЭБЕ РАБОЧЫХ У ПАЛІВЕ. Такім чынам, 33 ВАГОНЫ ДРОЎ АСТАЛІСЯ ЛЯЖАЦЬ НА СКЛАДЗЕ І НЕ МАГЛІ БЫЦЬ РАЗДАНЫ ПАЙШЧЫКАМ. За такую зла чынную нядбайнасць вінаватыя павінны быць прыцягнуты да судовай адказнасці.

***

Чаму спазніўся поезд № 857? Начальнік ст. Асіпавічы не заблокаваў паравоза ДОБРАЯКАСНЫМ ПАЛІВАМ. Таму поезд прыбліжа за ПАЎТАРА КІЛОМЕТРА ад Менска прымушан быў спыніцца з-за недахвата пары і стаяў некалькі гадзін. ГЭТА НЕ АДЗІНЫ ВЫПАДАК. Станцыя Асіпавічы сістэматычна за бяспечвае паравозы, якія ідуць з эшалонамі дроў для Менска, кепскім палівам І НА ДЗЕСЯТКІ ГАДЗІН ЗАЦЯГВАЕ ДАСТАЎКУ ДРОЎ РАБОЧЫМ МЕНСКА. Станцыя Асіпавічы не адчувае ніякай адказнасці за хутчэйшую дастаўку дроў. ГЭТУ ПРАКТЫКУ ТРЭБА СПЫНІЦЬ.

***

Учора калгаснікамі і аднаасобнікамі ЗАСЛАЎСКАГА РАЁНА прывезена ў Менск 190 фурманак дроў. З Чэрвеня прыбыло 360 фурманак — пераважна калгаснікаў і аднаасобнікаў ПУХАВІЦКАГА РАЁНА. Паводле паведамлення дырэктара гартопа тав. АМСТЭРДАМА, у Пухавіцкім раёне мабілізавана 800 ФУРМАНАК, усе яны павінны сёння быць у Менску.

***

Амаль уся колькасць дроў, прывезеных фурманкамі, была аддана закрытым установам і прадпрыемствам раёнаў Старажоўкі і Ляхаўні. Атрымалі таксама дровы заводы «Беларусь», імя Варашылава, «Большэвік», мясакамбінат, ТЭЦ і інш.

Аўтатранспарт таксама дастаўляе дровы выключна закрытым установам.

Такім чынам атрымліваецца, што АСНОЎНАЯ МАСА ДРОЎ ІДЗЕ НА ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЗАКРЫТЫХ УСТАНОЎ І ПРАДПРЫЕМСТВАЎ. Гэта тлумачыцца, як пісалі мы ўжо, тым, што падвозка дроў фурманкамі і аўтамашынамі каштуе ВЕЛЬМІ ДОРАГА і рабочым гэта недаступна. Здавалася-б, што гартоп павінен быў улічыць гэту акалічнасць і ўсе дровы, ЯКІЯ ПРЫБЫВАЮЦЬ ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРТАМ, АДДАВАЦЬ РАБОЧЫМ СПАЖЫЎЦАМ. Аднак і ўчора, і пазаўчора гартоп адпусціў са склада № 1 прадпрыемствам і ўстановам ЗНАЧНУЮ КОЛЬКАСЦЬ ДРОЎ.

Выходзіць, што гартоп НЕ ВЫКОНВАЕ ДЫРЭКТЫВЫ ЦК КП(б)Б АБ ВОДПУСКУ ПАЙШЧЫКАМ 50 ПРОЦ. ДРОЎ, ЯКІЯ ПРЫБЫВАЮЦЬ У ЯГО АДРАС. Мы лічым, што са склада № 1 трэба адпускаць дровы толькі пайшчыкам. Гартоп і камісія гарпрафсавета павінны ГЭТА ЎКАЗАННЕ ЎЛІЧЫЦЬ.

***

Як мы ўчора паведамлялі, першы эшалон з 38-ю баласнымі вагонамі, прыстасаванымі для пагрузкі дроў, падан на ст. Брожа. Эшалон прыбыў у 20 г. 20 м. Аднак, БАБРУЙСКІ ЛЕСПРАМГАС АДМОВІЎСЯ НОЧЧУ ГРУЗІЦЬ і да пагрузкі прыступлена толькі ў 6 г. раніцы 16-га снежня. Пагрузка закончана ў 13 г. 16-га снежня і эшалон павінен сёння раніцай прыбыць у Менск. ЕН МОГ БЫЦЬ НА СУТКІ РАНЕЙ, калі-б бабруйскі леспрамгас не адмовіўся грузіць эшалон ноччу.

Паводле паведамлення работніка Упраўкамшляха тав. СЦЕФАНОВІЧА, абсталяванне 2-га эшалона ў колькасці 35 баласных вагонаў скончана і ўчора ў 14 гадзін ён падан пад пагрузку дроў для Менска на ст. МОШНЫ.

Аднак, скончанне абсталявання баласных вагонаў НЕ ПАВІННА ЗМЕНШЫЦЬ ШТОДЗЕННУЮ КОЛЬКАСЦЬ КРЫТЫХ ВАГОНАЎ, ЯКУЮ ЧЫГУНКА ПАВІННА ПАДАВАЦЬ ДЛЯ ПАГРУЗКІ ДРОЎ. Наадварот — ПАДАЧУ КРЫТЫХ ВАГОНАЎ ТРЭБА ПАВЯЛІЧЫЦЬ. Чыгуначная адміністрацыя павінна цалкам пакрыць ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ, якая за першую дэкаду складае 154 вагоны, а за трэцюю пяцідзённую (выходзячы з дырэктывы ЦК КП(б)Б аб штодзённай падачы 150 вагонаў) складае 257 ВАГОНАЎ. Назапашасць дроў на станцыях пагрузкі складае на 17 снежня 1.129 ВАГОНАЎ. Гэту колькасць дроў трэба перакінуць у Менск на працягу НЕ БОЛЬШ ЯК ПЯЦІ-ШАСЦІ ДЗЁН. За гэту эканомію работнікі чыгуначнага транспарту павінны змагацца ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ.

Адгрузка дроў Менску

Леспрамгасы	Пераведзена да чыгункі	Запатрабавана вагонаў	Пагружана	Астача дроў на станцыі
(ЗА 15 СНЕЖНЯ)				
Асіпавіцкі	71	176	81	352
Петрыкоўскі	17	57	—	299
Мазырскі	9	82	44	75
Глускі	58	83	—	115
Бабруйскі	30	45	41	111
Парыцкі	—	—	—	56
Усяго	185	393	116	1.007
(ЗА 16 СНЕЖНЯ)				
Асіпавіцкі	94	70	47	399
Петрыкоўскі	11	95	—	310
Мазырскі	9	82	44	75
Глускі	41	80	32	124
Бабруйскі	30	53	—	141
Парыцкі	15	—	—	70
Усяго	207	328	85	1.120
(ЗА 17 СНЕЖНЯ)				
Асіпавіцкі	—	65	45	—
Петрыкоўскі	60	60	62	—
Мазырскі	17	38	—	—
Бабруйскі	1	70	24	—
Глускі	вестак не дані			
Парыцкі	вестак не дані			

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б паведамляе аб пачатку работы мандатнай камісіі па адборы кандыдатур для пасылкі ў гаспадарчыя акадэміі: усесаюзную, імя тав. Сталіна, ленінградскую прамакадэмію, усесаюзную прамакадэмію Наркамлегпрома, архангельскую прамакадэмію Наркамлеса, планавую акадэмію, фінансавую акадэмію, акадэмію снабжэння НКСнаба.

У азначаныя акадэміі прымаюцца кіруючыя гаспадарчыя работнікі (дырэктары трэстаў, прадпрыемстваў, начальнікі цэхаў), маючыя вопыт кіруючай работы і пасляхова прадэманстраваўшыя на практычнай рабоце, выкананнем прамфінплан.

Жадаючыя паступіць на вучобу ў гаспадарчую акадэмію павінны прадставіць заяву і анкету ў аддзел кадраў ЦК КП(б)Б, не пазней 25 снежня г. г.

Заг. аддзелам кадраў ЦК КП(б)Б ДЗЕНІСЕВІЧ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ПАСТАНОВА

Менскага гарадскога фінансавага аддзела

17 снежня 1933 г. г. Менск.

Менскім гарфінаддзелам устаноўлена, што:

1) Кіраўніцтва завода «Беларусь» спачатку прыбытковы падатак з рабочых і служачых завода не пры выдачы зарплаты за 2-ю палову месяца, а пры выдачы зарплаты за 1-ю палову наступнага месяца па зарплаце мінулага месяца.

За май і чэрвень т. г. прыбытковы падатак налічан няправільна, у бок змяншэння. Здача утрыманых сум у Дзяржбанк праводзіцца несваячасова.

Спагнанне культабора спынена ў верасні, не гледзячы на тое, што ёсць асобы, з якіх культабор не ўтрымаў поўнасцю.

Пералічэнне культабора праводзіцца несваячасова. На час праверкі —15-XII-33 г.—была запазычанасць у 5,8 руб. 42 к.

2) Кіраўніцтва малочнага завода, не гледзячы на выяўленае пры праверцы 10-IX-г. г. няправільнае ўтрыманне прыбытковага падатка, пры паўторнай праверцы 14-XII-33 г. прадпусціла няправільна ўтрымліваць прыбытковы падатак, праводзячы ўтрыманне ў бок памяншэння.

3) Кіраўніцтвам фабзавуча імя КІМ няправільна ўтрымліваўся прыбытковы падатак як у бок павялічэння, так і памяншэння.

Таксама няправільна ўтрымліваўся культабор.

Культабор здаваўся несваячасова. Разлік на культаборы за верасень праведзен толькі 13-XII г. г.

4) Кіраўніцтва арцелі «Чырвоны абутнік» несваячасова пералічвала прыбытковы падатак і культабор. На час праверкі — 15-XII-33 г. —была запазычанасць па прыбытковаму падатку на 1428 р. 51 к. і культабора—1136 р. 20 к.

Выходзячы з вышэйпаказанага Менскі гарфінаддзел

ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. На бухгалтара завода «Беларусь» т. Кандрацьева, касіра малочнага завода т. Біруля, бухгалтара фабзавуча імя КІМ т. Фрыда і арцелі «Чырвоны абутнік» т. Гурвіча накласці штраф на 25 руб. на кожнага, папярэдзіўшы іх і кіраўніцтва, што, у выпадку паўторнай, недахопаў у спагнанні і пералічэнні прыбытковага падатка, будуць прыняты больш суровыя меры.

2. Папярэдзіць усіх кіраўнікоў і бухгалтароў прадпрыемстваў, устаноў і арцелей прамысловай і інвалідзкай кааперацыі г. Менска і раёна, што няправільнае налічанне, утрыманне і несваячасовая здача утрыманай сумы прыбытковага падатка і культабора пацягне за сабой прыцягненне вінаватых да адказнасці.

Загадчык Менгарфа ЕЛІНЕЎСКІ.

СЁННЯ, 19 снежня ў 7 гадз. вечара ў Доме Комсаюзаў АБЫДЗЕЦЦА даклад акадэміка ВАЛЬФСОНА НА ТЭМУ: „Культура будуючагася социялізма і загніваючы капіталізм". Уваход па разасланых білетах. Неатрымаўшых білетаў могуць атрымаць у канцылярыі Дома Комсаюзаў.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Ад 19 снежня
Рычард ТОЛМЕДЖ
У ЗАМЕЖНАЙ КАМЕДЫІ
ВАЛАБРАЖАЛЬНЫ АТАРНЕЙ
У ПРАГРАМЕ Союзкіно хроніка № 19 „ЗА СОЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ВЁСКУ"

ЧЭРЫКАЎСКІ ВЕТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ абвяшчае ЗІМОВЫ НАБОР на 1 курс тэхнікума ў колькасці 30 асоб. У тэхнікум прымаюцца асобы, скончыўшыя самадзейку па іспытам, а скончыўшыя восем груп без іспыту.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам і сталоўкай. Прыём заяў да 25 снежня, іспыты 28—31 снежня, зачатні з 1 студзеня 1934 г.

Заявы з дакументамі аб соцстаноўішчы, адукацыі, узросце, здароўі і заснедчанай анкетай, 40 кап. маркамі накіроўваць па адрасу: г. Чэрыкаў, ветэтэхнікуму.

Дырэкцыя.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"



ДЗЕШ ДАПУШЧАЮЦЦА ТОЛЬКІ НА 1 СЕАНС ад 4 гадз. 30 мін.

СЁННЯ ад 19 снежня ПРЭМ'ЕРА НОВЫ ГУКАВЫ ГАВАРАШЧЫ ФІЛЬМ КАНВЕЕР СМЕРЦІ
Тонфільм у 9 част. Рэж. І. Пырыеў. Гукавар. К. Ключэўскі. У гал. ролях: Ада Войцык, Вера Пазняк, Шахоўскі, Макарава і інш.
Тэкст песенькі „Лінкс" — С. Кірсанова.
ШТО ДЗЕНЯ 4 СЕАНСЫ.
ПАЧАТАК а 1-30, 6.45, 9 і 1 гадз.

КІНО ПРОЛЕТАРЫЙ — МЕРЫ ПКФОРД у кароткае МЫЛЬНАЯ ПЕНА
КІНО СПАРТАК — Замежны фільм ЗЯЛЁНЫ ЗАВУЛАК драма ў 6 частках.
ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР — Гукавы мастацкі фільм БЛАКІТНЫ ЭКСПРЭС

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР ул. Валадарскага, 7, тел. № 21-813, 23-554, 24-122
Адкрытыя спектаклі 2, 23, 24, 25 снежня
ПАРТЫЗАНЫ
Пастаноўка Ю. Ф. РАФАЛЬ НАГА.
Пачатак у 8 гадз. вечара
Білеты і ў касе тэатра.

Даводзіцца да ведама ўсіх гандлюючых (купляючых тавары) арганізацый, што Усебеларускай Канторай Дзяржбанка
ПРАДАЮЦЦА НАСТУПНЫЯ ТАВАРЫ, НАЛЕЖАЧЫЯ:
Фотаапараты, канцтавары, метал, папера, газометры, перья, радыё, літаратура, трыножнік, мікрометры, ста к свідравальн. ручкі вучн., фуганкі, цацкі і інш. на руб. 200.000 — БАКТУ
Кардон. саржа чорная, для чэмадан. на руб. 35,000 — ф-цы „Усход".
Крахмал на руб. 9.630 — з-д „Чырв. Золак".
Чорная паста, тэхнічная тканьвы, калошкі, бальгрыко, воск, ніткі і інш. на р. 100.000. — Абутковай ф-цы
Махорка на руб. 61.000 — Базе „Табакторга"
Электраматоры, эмаль чорная, на руб. 5.239 — Белдзяржснабу
Балеткі, трыко, каламазь, віно на руб. 30.000 — Райспажыўсаюзу
Пудра, одэкалон. на руб. 7447.— — Базе ОВКУ
Вольтметр на руб. 2270 — Эльзбыту ВЭА
Камбінэ дамское на руб. 5420 — Белпрамгандлю
Бульба на руб. 79.000 } — Плодгародтрэсту
Цеста брусн 4.000 }
Мездра на руб. 1.100 — з-ду „Большэвік."
Фота-мотор на руб. 5.250 — Белдзяржкіно
Звяртацца ў Дзяржбанк да тав. Граната.

Даводзіцца да ведама зацікаўленых арганізацый, што снабжэнне Івамаўскай вобласці, ЦЧ, Беларускай ССР, Горнаўсняга краю, Чувашскай аўтаномнай вобласці, Татрэспублікі
Каўказскімі натуральнымі мінеральнымі водамі
(НАРЗАН, ЕЗЕНТУКІ СМІРНОЎСКАЯ, СЛАВЯНСКАЯ, БАТАЛІНСКАЯ)
у 1934 годзе будзе утварацца праз МАСКОЎСКУЮ КАНТОРУ І СКЛАД „КАВМИНРОЗЛИВА".
Прапануецца подаць ЗАЯЎКІ на 1934 год у паўлітравым вылічэнні, з паказаннем патрэбы па месяцах, не пазней 15 снежня 1933 года.
ЗАЯЎКІ НАКІРОЎВАЦЬ: Москва, центр площадь Свердлова 2-10, пом. 6, Кавминрозливу.

Друкарня «Звязды» Галоўлітлит № 337.